Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

24 КРАСАВІКА 2008 г.
ЧАЦВЕР
№ 78 (26191)

Кошт 430 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

«Прамыя лініі» па вашых просьбах!

ЗАБЫТАЕ? НОВАЕ? ВЕЧНАЕ!

Як лепш справіць вяселле? Хто можа быць хросным бацькам ці маці і якія правілы існуюць у дачыненні да правядзення хрэсьбінаў? Як правільна правесці пахаванне і памінанне? Як арганізаваць улазіны? На ўсе вашы пытанні, якія датычацца ролі і месца народных традыцый у сённяшнім жыцці, адкажуць падчас «прамой лініі» нашы пастаянныя аўтары — **загадчык кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, кандыдат філалагічных навук Іван Іванавіч (Янка) КРУК і старшы выкладчык гэтай жа кафедры Аксана Веніямінаўна КАТОВІЧ.**

«Прамая лінія» пройдзе СЁННЯ з 15.30 да17.00. Тэлефануйце ў рэдакцыю па нумарах: 292 38 92; 292 38 21. (Кантактны тэлефон для папярэдніх званкоў — 292 21 03).

РАБОТА, АДПАЧЫНАК І... ЖЫЛЛЁ

Усё гэта стане тэмай «прамой лініі» газеты «Звязда» з удзелам **загадчыка юрыдычнай кансультацыі галоўнага прававога ўпраўлення апарату Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Уладзіміра Іванавіча ШЭЛКОВІЧА і намесніка загадчыка юрыдычнай кансультацыі Васіля Мікалаевіча КОРСУКА.**

«Прамая лінія» пройдзе 25 красавіка з 11 да 12 гадзін па рэдакцыйных тэлефонах (8 017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні прымаюцца па нумары 287 17 57.

БУЛЬБУ І ЯБЛЫКІ — НА ЧЫПСЫ!

23 красавіка Сяргей Сідорскі наведаў прадпрыемствы ў Магілёўскай вобласці, дзе адбываецца рэканструкцыя вытворчасці альбо будуецца наноў.

Быхаўскі кансервава-гароднінасушыльны завод — адно з 24 перапрацоўчых прадпрыемстваў Беларусі, якія павінны быць пераабсталяваны на працягу бліжэйшых двух-трох гадоў. Паводле ўказа Прэзідэнта, на гэтую праграму выдаткаваны значныя фінансавыя сродкі. Быхаўскі праект каштуе амаль 40 мільярдаў рублёў. У новым вялікім цэху цяпер шпарка ідзе праца...

На выставе прадукцыі прадэманстравана эвалюцыя быхаўскага прадпрыемства. Учора былі трохлітровыя слоікі пад састарэлымі накрыўкамі, а заўтра будуць агароднінныя прысмакі ў сучаснай і зручнай шкляной тары. Дырэктар завода Сяргей Пераход паведаміў, што аб'ёмы павялічацца ўдвая, прычым з'явяцца яшчэ 80 новых відаў прадукцыі.

— Такія сучасныя заводы, як у Быхаве, павінны працаваць па тэхналагічнай лініі: поле — перапрацоўка — сучасная ўпакоўка, — пракаментаваў Сяргей Сідорскі. Трэба стварыць аграхолдынгі, якія будуць зацікаўленыя пастаўляць якасны прадукт на кансервавыя заводы. А прадпрыемствы, калі рэалізуюць прадукцыю, павінны будуць падзяліцца прыбыткамі з тымі, хто працуе на зямлі.

Дарэчы, прэм'ер-міністр параіў уключаць у традыцыйныя сыравінныя зоны і прыватныя падворкі.

Другая важная тэма — рэалізацыя прадукцыі. Урад прагназуе, што на працягу двух гадоў новыя перапрацоўчыя прадпрыемствы ўдвая павялічаць аб'ёмы прадукцыі. Таму трэба працаваць з тавараправоднымі сеткамі, каб беларуская кансерваваная гародніна трапіла не толькі на паліцы айчынных крамаў, але і ў замежжа.

Сёлета запрацуе прадпрыемства **«Слаўгарадскі харчавік».** Тут вытворчасць заснаваная на абсалютна новай тэхналогіі сушкі інфрачырвоным выпраменьваннем, якая належыць карпарацыі «Руская ежа». Атрымліваюцца сухія харчы, якія можна спажываць пасля дабаўлення вадкасці. Яны шырока выкарыстоўваюцца і ў харчовай прамысловасці. Па словах дырэктара Аляксандра Самусева, у Слаўгарадзе будуць вырабляць 100 тон сухіх харчоў у месяц.

— Кошт такога прадукту, умоўна кажучы, на ўваходзе 100 рублёў, а на выхадзе — 1,5 тысячы, — тлумачыў эканамічную выгаду кіраўнік беларускага ўрада. — Гэта значыць, стопрацэнтная рэнтабельнасць. А завод кампактны і недарагі, у сярэднім каштуе мільён долараў. Таму на праграме інавацыйнага развіцця мы будзем ставіць падобныя заводы ў Беларусі, каб атрымліваць высокаліквідную даходную прадукцыю.

Тавар, які карыстаецца вялікім попытам, праз чатыры месяцы атрымаюць у **ААТ «Новая Друць» Бялыніцкага раёна.** Гэта будзе крухмал высокай якасці. На пляцоўку новага крухмальнага завода, які будуецца па кітайскім праекце, завітаў Сяргей Сідорскі.

Прэм'ер расказаў журналістам, што вырашана зрабіць тут замкнёны цыкл: дадаць да асноўнай вытворчасці крухмалу яшчэ дзве дадатковыя. На адной лініі будзе апрацоўвацца і фасавацца кандыцыйная бульба для патрэбаў рэстаранаў, а на другой — вырабляцца папулярныя бульбяныя чыпсы.

Гэты завод будзе апрацоўваць за суткі сто тон бульбы, слаўгарадскае прадпрыемства зможа ў суткі перарабіць 30 тон бульбы, мае патрэбу ў павелічэнні паставак раслінай сыравіны і завод у Быхаве. Ці хопіць на ўсіх прадукцыі сельскай гаспадаркі?

— Мы шмат зрабілі за апошнія гады для атрымання большых аб'ёмаў вытворчасці ў вёсцы, — адказаў Сяргей Сідорскі. — Ураджай буракоў — больш за 3 мільёны тон, бульбы — мы ж бульбяная краіна! — 8 мільёнаў тон. Але як гэта сёння запатрабавана? Тую ж бульбу трэба перапрацоўваць у чыпсы. Мы заклалі яблыневыя сады, і трэба гандляваць не толькі яблыкамі, але і тымі ж яблычнымі чыпсамі. Збожжа — у якасную макарону, як у Барысаве. Трэба, каб усё вырабленае на полі было запатрабавана перапрацоўкай. Каб нашы буракі ды морква з'явіліся на паліцах якасным прадуктам у сучаснай упакоўцы.

Рабочы візіт Сяргея Сідорскага ў Магілёўскую вобласць завяршыўся ў **Шклове, на заводзе па вырабе газетнай паперы.** Кіраўнік Урада паведаміў, што сустракаецца з аўстрыйцамі, немцамі і славенцамі з мэтай поўнасцю ўвязаць тэхналагічны цыкл.

— Каб запусціць завод і атрымаць аб'ём прадукцыі, трэба адпрацаваць тэхналагічны цыкл, — патлумачыў Сідорскі. — Сёння ў Шклове мы практычна падышлі да гэтага. Думаю, што да 1 мая павінна ўсё атрымацца. Мы стварылі магутны камбінат там, дзе два гады таму было чыстае поле. Сёння ў Шклове мы ставім абсталяванне самага высокага ўзроўню. Такіх заводаў усяго 10, і адзін з іх — у Беларусі. Прычым ён таннейшы на 20 працэнтаў за аналагі і на 40 працэнтаў менш спажывае энергіі. Я ўпэўнены, што для Беларусі гэта будзе вельмі важны і добры комплекс.

Ілона ІВАНОВА.

Быхаў — Слаўгарад — Магілёў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЧЫСТЫ ЧАЦВЕР

ХАБАР ЗА... КАНАЛІЗАЦЫЮ

Наваполацкай пракуратурай узбуджана крымінальная справа ў дачыненні да начальніка ўчастка каналізацыйных і ліўневых сетак водаканала. Ён, як высветлілі супрацоўнікі аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі ГАУС, атрымаў хабар у памеры 300 долараў за прачыстку і прамыўку каналізацыйных сетак на ўчастку адной з фірмаў па-за чаргой.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Падрыхтоўка да Вялікадня ў Мазыры.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже здания магазина, об. пл. 199,0 кв.м, расположенного в г. Мядель по ул. Крупской, 8. Начальная цена с НДС – 130 657 282 бел. руб. Площадь земельного участка 0,0760 га. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 20.03.2008 г. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 02 мая 2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 30 апреля 2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 224 61 34.
Сайт в Интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ПАЖАРНЫЯ ЗАТРЫМАЛІ ЗЛАЧЫНЦУ

Пажарныя з вёскі Астроўна Бешанковіцкага раёна Аляксандр Скарынкін і Павел Самойлаў затрымалі 39-гадовага раней судзімага, які скраў з касы сельскай крамы больш за 153 тысячы рублёў.

Каля 17 гадзін нецвярозы скраў з крамы спажывецкай кааперацыі «Прыазёрны» грошы і пабег.

— Мой калега Аляксандр Скарынкін — камандзір аддзялення жыве побач з крамай. Ён хутка разабраўся ў сітуацыі і пачаў даганяць злачынцу. А мая жонка, якая працуе ў гэтым магазіне, патэлефанавала мне, і я выехаў насустрач на асабістым аўто. Так мы яго і затрымалі.

Кіраўніцтва Бешанковіцкага РАУС вырашыла прэміраваць пажарных за знаходлівасць.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПАЖАР НА «ГАРЫЗОНЦЕ»

На пачатку дванаццатай дня ў аўторак у адным з цэхаў ААТ «Гарызонт», дзе ідзе рэканструкцыя, пачаўся пажар. Выратавальнікам прыйшлося эвакуяваць з цэха 40 чалавек. Прычынай узгарання стала парушэнне правілаў бяспекі пры зварцы.

Ігар ГРЫШЫН.

ЗАРПЛАТА: СТАБІЛЬНЫ РОСТ

У першым квартале гэтага года ў краіне была захавана тэндэнцыя росту зарплаты работнікаў галін эканомікі, зазначылі ў Міністэрстве эканомікі.

Што датычыцца бюджэтнай сферы, то за згаданы перыяд намінальная налічаная сярэднямесячная зарплата павялічылася на 13,8 працэнта і склала 639,4 тысячы рублёў, у тым ліку ў лютым — 645,4 тысячы (300,3 долара). Рост рэальнай зарплаты ў цэлым па рэспубліцы за два месяцы — 9,3 працэнта.

За тры месяцы гэтага года ў параўнанні з леташнімі студзенем—сакавіком сярэднямесячны памер пенсіі па ўзросце павялічыўся на 23 працэнты і склаў 359,4 тысячы рублёў, у тым ліку ў сакавіку — 366,3 тысячы. Сярэднямесячны памер мінімальнай пенсіі за гэты час узрос да 198,2 тысячы рублёў, або на 19,9 працэнта, у тым ліку ў сакавіку ён склаў 202,4 тысячы. Рэальны памер пенсіі па ўзросту ў студзені-сакавіку сёлетняга года ў параўнані з адпаведным леташнім перыядам узрос на 8,8 працэнта.

Ігар ГРЫШЫН.

ЖЫХАРЫ СЛОНІМА АСУДЖАНЫ ЗА ПАДРЫХТОЎКУ ЗАБОЙСТВА ШКОЛЬНІЦЫ

Аб гэтым паведамілі ў Генеральнай пракуратуры Беларусі.

Была разгледжана крымінальная справа па абвінавачанні Мартынава С.В. і яго сужыцелькі Шубабы Ж.Р. у арганізацыі забойства непаўналетняй свячкі першага. Мэтай плануемага злачынства было авалоданне доляй жылплошчы дзяўчынкі ў кватэры, атрыманай у спадчыну.

Абвінавачаныя заняліся пошукам выканаўцы забойства школьніцы. Пасля атрымання гэтай інфармацыі адзін з супрацоўнікаў управлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй (УБАЗіК) па Гродзенскай вобласці пад выглядам магчымага выканаўцы сустрэўся з заказчыкам, які паабяцаў заплаціць $600 за учыненне злачынства. Пасля інсцэніроўкі забойства і перадачы грашовага ўзнагароджання заказчык быў затрыманы. У адносінах да яго і сужыцелькі была ўзбуджана крымінальная справа. У ходзе папярэдняга і судовага следства абодва абвінавачаныя былі прызнаны вінаватымі і асуджаны на 13 гадоў пазбаўлення волі кожны.

«ЗАЯЦ» З НАЖОМ

Размова пойдзе пра пасажыра, які ў вячэрні час ехаў у аўтобусе на добрым падпітку.

Білет набыць у кандуктара ён катэгарычна адмовіўся, і калі тая пачала настойваць на сваім, ён адказаў мацюкамі. Адзін мужчына спрабаваў нагадаць «зайцу» пра яго грамадзянскі абавязак, прасіў яго паводзіць сябе прыстойна, і гэта выклікала, як выявілася пазней, у неаднаразова судзімага хулігана злосць. Ён дастаў з кішэні нож і пачаў пагражаць ім. Тут у справу ўмяшаліся і іншыя пасажыры, якія прапанавалі вадзіцелю аўтобуса заблакіраваць дзверы, пасля чаго быў выкліканы нарад міліцыі. Хуліган змешчаны ў Гомельскі ізалятар часовага ўтрымання.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

МЯРКУЕЦЦА ВЯРНУЦЬ АСОБНЫЯ «ЧАРНОБЫЛЬСКІЯ» ЛЬГОТЫ

Як паведаміў начальнік аддзела сацыяльнай абароны Дэпартамента па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Уладзімір Кудзін, падрыхтаваны праекты двух указаў кіраўніка дзяржавы, у адпаведнасці з якімі мяркуецца вярнуць некалькі «чарнобыльскіх» ільгот.

У прыватнасці, гаворка вядзецца аб вяртанні кампенсацыйных выплат (іх плануецца аднавіць з пачатку гэтага года), якія прызначаліся за шкоду здароўю, атрыманую ў выніку захворвання альбо калецтва ў сувязі з выкананнем работ па ліквідацыі наступстваў аварыі на ЧАЭС. Да гэтай катэгорыі адносяцца грамадзяне, якія часткова страцілі працаздольнасць, аднак ім не была прызначана ні адна з груп інваліднасці. Як заўважыў Уладзімір Кудзін, агульная сума дадатковых выплат складзе каля 1 мільярда рублёў у год. Унесены таксама прапановы аб ільготным крэдытаванні вызначаных катэгорый «чарнобыльцаў» падчас будаўніцтва жылля. Паводле меркавання Уладзіміра Кудзіна, гэтыя меры (калі будзе прынята станоўчае рашэнне) дазволяць павысіць узровень сацыяльнай абароненасці людзей, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Дарэчы, аднымі з найбольш абароненых сярод удзельнікаў ліквідацыі аварыі на ЧАЭС застаюцца інваліды I і II груп, лічыць спецыяліст. Да прыкладу, сярэдняя пенсія інвалідаў-чарнобыльцаў I групы складае 1,4 мільёна рублёў у месяц, II групы — 1,1 млн, III групы — каля 600 тыс. рублёў.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

Наведванне могілак на Вялікдзень — непаслушэнства Царкве

«Мой муж родам з Віцебшчыны, і я са здзіўленнем даведалася, што там ёсць традыцыя на Вялікдзень ісці на могілкі. Ці з'яўляецца яна заганнай з пункту гледжання Праваслаўнай царквы?»

Святлана Федаровіч, *г. Мінск.*

— Ні ў якім разе, — адказвае архімандрыт Алексій (Шынкевіч). — Ніякія народныя традыцыі Царква не лічыць заганнымі, калі яны не супярэчаць духу хрысціянства. Вось і тут, галоўнае, каб наведванне могілак не супярэчыла духу Пасхі. Недапушчальным з'яўляецца распіцце на могілках спіртных напояў і амаральныя паводзіны. Мэта прыходу туды — хрыстосаванне з памерлымі. Памятаеце, якая асноўная ідэя пасхальных песнапенняў? «Хрыстос уваскрэс з мёртвых, смерцю смерць зваяваў, і тым, што ў МАГІЛАХ, жыццё дараваў!» Менавіта таму царква прызначыла спецыяльны для гэтага дзень — дзевяты пасля Уваскрэсення Госпада — Радаўніцу. Назва яго паходзіць ад слова «радасць». Бо першае слова, якое сказаў Гасподзь пасля Свайго Уваскрэсення, было: «Радуйцеся!» Няма граху ў тым, што людзі ідуць на могілкі ў сам Вялікдзень. Гэта свайго роду непаслушэнства Царкве. Для тых, хто ўжо не з намі, галоўнае не прыход наш на іх магілы, а малітва за іх душы, асабліва — памінанне на літургіі, калі за памерлых падаюцца запіскі, па якіх вымаюцца часціцы з прасфары, здзейсняюцца малітвы, а потым гэтыя часціцы апускаюцца ў святую Чашу — у Кроў Гасподнюю, са словамі: «Отмый, Господи, грехи поминавшихся зде, Кровию Твоею честною». І як часціцы прасфар прамакаюць ад Крыві Гасподняй, так благадаць Яго дакранаецца душ спачылых, бо ў Яго ўсе жывыя.

Падрыхтавала Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Балючая тэма

«МАЎЧАННЕ ПАКУСАНЫХ»

Летась у медыцынскія ўстановы нашай краіны звярталіся 24 529 чалавек, якія пацярпелі ад нападаў «чатырохногіх агрэсараў», а ў суды паступіла ўсяго 25 іскаў з патрабаваннем кампенсацыі шкоды.

Ёсць людзі, якія не хочуць адказваць за тых, каго прыручылі. Менавіта ў такіх гора-гаспадароў і жывуць сабакі, якія нясуць пагрозу самім уладальнікам, іх родным і блізкім, суседзям і нават выпадковым прахожым. Вось некалькі самых жудасных прыкладаў, калі сабака па віне гаспадара пераўтвараецца з сябра ў смяротнага ворага чалавека.

Паводле звестак упраўлення інфармацыі і сувязяў з грамадскасцю Генеральнай пракуратуры ў верасні мінулага года жыхар Мінска пакінуў у ванным пакоі сваю шасцімесячную дачушку разам з сабакам. «Чатырохногая нянька» так пакусала дзіця, што ад атрыманых ранаў яно памерла.

У вёсцы Каінічы Быхаўскага раёна гаспадар выпусціў пагуляць дваіх «бобікаў». Ашалелыя ад водару волі сабакі накінуліся на загадчыцу мясцовай малочнатаварнай фермы і загрызлі жанчыну да смерці.

Ахвярай «хвастатых забойцаў» стаў таксама і 76-гадовы жыхар вёскі Рубеж Лельчыцкага раёна. Ён не змог уратавацца ад сабачай зграі нават на ўласным падворку.

А колькі людзей штогод атрымліваюць рознай ступені цялесныя пашкоджанні ад агрэсіўных сяброў чалавека! Паводле звестак Генеральнай пракуратуры, летась у органы аховы здароўя звярнуліся 24 529 чалавек, якіх пакусалі хатнія і дзікія жывёлы. Больш за 1 тысячу нашых грамадзянаў пацярпелі ад шалёных сабак, катоў і іншых жывёл і звяроў. Аднак найчасцей людзі становяцца ахвярамі «сабак-агрэсараў», чые гаспадары не клапоцяцца пра меры бяспекі. Многія ўладальнікі ў людных месцах выгульваюць сабак без намордніка і павадкоў. А службовыя асобы жыллёва-эксплуатацыйных службаў не заўсёды звяртаюць увагу на такія парушэнні. У 2007 годзе ў дачыненні да непаслухмяных гаспадароў хатніх жывёл было складзена ўсяго 524 пратаколы. Хоць парушэнні такога кшталту адбываюцца штодзень і на кожным кроку.

Таму па выніках спецыяльнай праверкі Генеральны пракурор Рыгор Васілевіч накіраваў прадстаўленне міністру жыллёва-камунальнай гаспадаркі з патрабаваннем выправіць выяўленыя парушэнні заканадаўства аб утрыманні хатніх жывёл, палепшыць прафілактычную працу. Камунальнікам таксама давядзецца заняцца будаўніцтвам і ўпарадкаваннем пляцовак для выгулу сабак. Бо часам з-за адсутнасці такіх месцаў гаспадары сабак проста вымушаны выгульваць сваіх выхаванцаў у дварах, на тэрыторыях школ, на стадыёнах і г.д.

Ды і ахвярам «чатырохногіх агрэсараў» таксама варта павучыцца адстойваюць свае правы. Летась у суды паступіла ўсяго 25 іскаў з патрабаваннем кампенсацыі шкоды, нанесенай укусамі сабак. І гэта пры тым, што колькасць ахвяраў амаль у тысячу разоў большая. На думку пракуратуры, «маўчанне пакусаных» тлумачыцца прававой неадукаванасцю насельніцтва Беларусі. Прасцей кажучы, многія нашы грамадзяне не ведаюць аб магчымасці спагнаць праз суд кампенсацыю за «сабачае хуліганства».

Мікола ДЗЯБЁЛА.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже здания ателье № 5, об. пл. 155,0 кв.м, расположенное: г. Слуцк, ул. Жукова, д. 21. Площадь зем. участка 0,0595 га. Начальная цена с НДС – 80 000 000 бел. рублей. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 22.02.2008 г. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 13.05.2008 г. в 15.00 по адресу: г. Слуцк, ул. Уласовца, 3.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 12.05.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 224 61 34
Сайт в Интернете: www.rlt.by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

Арэнда жылля пераходзіць на еўра і... даражэе

Тэндэнцыя на патанненне амерыканскай валюты сыграла не вельмі на руку новым кватарантам сталічнага жылля. Гаспадары «лішніх квадратаў» толькі за апошні месяц істотна павялічылі доларавы цэннік. Дзіўна, але цэнавыя змяненні на рынку арэнды назіраюцца ў той час, калі прапанова кватэр істотна павялічылася, а попыт нават знізіўся.

АДНАПАКАЁЎКІ ДАСЯГНУЛІ 300 USD

Паводле інфармацыі начальніка аддзела арэнды жылля агенцтва «Час пік» Сяргея Кадола, сёння зняць звычайную аднапакаёвую кватэру не вельмі далёка ад метро можна не танней чым за 300 долараў. Таннае жыллё сёння практычна знікла з рынку арэнды ў Мінску. Нават у самых далёкіх новабудоўлях арэнда маленькіх кватэр каштуе больш за 200 долараў. Невысокія па якасці аднапакаёвыя кватэры ў Сухараве, Малінаўцы, Шабанах і Заводскім раёне коштам 240—250 долараў знаходзяць сваіх новых гаспадароў максімум за некалькі дзён. Разам з тым усё большая колькасць уласнікаў жыллёвай нерухомасці пачынае здаваць свае памяшканні выключна за еўра. Звычайна аднапакаёвыя кватэры здаюць за 160—200 еўра. Апошнім часам памер арэндная платы жылых метраў ужо амаль не залежыць ад месцазнаходжання дома па раёнах, бо транспартная сетка Мінска бадай па ўсіх накірунках функцыянуе на стабільна якасным узроўні. Выключэннем застаецца цэнтр сталіцы, дзе кошт арэнды любой па якасці кватэры пачынаецца з 350 долараў.

ПОПЫТ НА ШМАТПАКАЁЎКІ — МІНІМАЛЬНЫ

Ужо на працягу апошніх 7—8 месяцаў на другасным рынку жыллёвай нерухомасці назіраецца стабілізацыя і паступовае патанненне квадратнага метра. З першых дзён красавіка ў краіне пачала дзейнічаць новая сістэма аплаты рыэлтарскіх паслуг, калі гэтыя паслугі падаражэлі прыкладна на тысячу долараў менавіта для прадаўцоў нерухомасці. У выніку, гэтыя фактары падштурхнулі частку ўладальнікаў «лішніх» кватэр пакуль не прадаваць гэта жыллё, а здаваць яго ў арэнду.

Пасля гэтага на рынак трапіла пэўная колькасць якасных двух- і трохпакаёвых кватэр, якія былі падрыхтаваны для продажу. Прапанова павялічылася, а попыт у апошнія месяцы вясны нават знізіўся, бо студэнцкі ажыятаж пачнецца толькі ў ліпені-жніўні.

Цяпер выбар шматпакаёвых кватэр самы высокі. Мінімальны кошт арэнды двухпакаёвай кватэры складае 300—350 долараў, а трохпакаёвай — пачынаецца з 350 долараў. Невялікі попыт на вялікія кватэры вымушае гаспадароў здаваць трох- і двухпакаёвыя кватэры ў якасці двух- і аднапакаёвых кватэр, калі адзін пакой з якасной мэбляй і бытавымі прыборамі ўвогуле зачыняецца.

ЭЛІТНЫЯ КВАТЭРЫ ПАДАРАЖЭЛІ Ў 1,5 РАЗА

Яшчэ некалькі месяцаў таму прасторныя кватэры з еўрарамонтам у прэстыжных дамах здаваліся дорага, але за долары. Сярэдні цэннік на такія кватэры з сучаснай мэбляй і бытавымі прыборамі вагаўся ў межах тысячы-тысячы ста долараў. Сёлета перспектывамі інвестыцыйнай дзейнасці ў сталіцы нашай краіны зацікавілася вялікая колькасць камерцыйных структур з боку краін Азіі. У выніку немалая колькасць дыпламатаў і замежных камерсантаў пачалі шукаць сабе якаснае жыллё. Цяпер элітныя кватэры каштуюць ужо не каля тысячы долараў, а больш за тысячу еўра.

Увогуле, сёння сярод усіх «прасунутых» уладальнікаў арэнднага жылля назіраецца масавая тэндэнцыя, калі кватэры здаюць не за долары, а за больш стабільную валюту — еўра.

ЗА 5 БАЗАВЫХ — ТОЛЬКІ СПІС ВАРЫЯНТАЎ, АБО ЎВОГУЛЕ «КІДАЛАВА»

Згодна з новымі ўмовамі аплаты рыэлтарскіх паслуг тарыфы па пошуку аб'ектаў арэнды жыллёвага фонду для фізічных асобаў складаюць 5 базавых велічынь, або 175 тысяч рублёў.

Сяргей Кадол адзначыў, што за такія грошы кліенту могуць прапанаваць толькі спіс магчымых варыянтаў для самастойнага пошуку. Такімі, выключна інфармацыйнымі паслугамі яшчэ 5—10 гадоў таму займаліся шэрыя фірмы-аднадзёнкі, што часам прапанавалі кліентам старыя, або «левыя» адрасы. Сама працэдура ажыццяўлення падобных паслуг атрымала народную назву «кідалава».

Сур'ёзныя агенцтвы спісы за 5 ББ не прапануюць, а працуюць з кліентамі па факце засялення. А такая паслуга разам з афармленнем неабходных дакументаў каштуе ўжо 10 базавых велічынь, або 350 тысяч рублёў.

Сяргей КУРКАЧ.

Уладзімір РУСАКЕВІЧ:

«Няхай чытач мае розную інфармацыю, няхай сам выпрацоўвае ўласную думку»

На друкаваныя СМІ з рэспубліканскага бюджэту выдзяляецца каля Br5 млрд у год, гэтыя сродкі выкарыстоўваюцца рацыянальна. Аб гэтым паведаміў учора ў час online канферэнцыі на сайце **Беларускага тэлеграфнага агенцтва** міністр інфармацыі Беларусі Уладзімір Русакевіч. Ён выказаў удзячнасць кіраўніцтву краіны за тое, што цяпер асаблівая ўвага ўдзяляецца развіццю электронных сродкаў масавай інфармацыі, якое таксама патрабуе выдзялення немалых сродкаў. Паводле слоў Уладзіміра Русакевіча, колькасць газет, што выдаюцца і распаўсюджваюцца ў Беларусі, у разліку на 1 жыхара практычна самая высокая ў Еўропе. «Значыць, друкаванае слова ў Беларусі запатрабавана, людзі многа чытаюць», — сказаў ён.

Закранаючы пытанне аб абароне інфармацыйнай прасторы, міністр інфармацыі выказаўся супраць «шлагбаумаў», якія даказалі сваю неэфектыўнасць яшчэ ў часы Савецкага Саюза. «Наш метад — развіццё беларускіх СМІ, асабліва электронных, выданне газет на замежных мовах і іх распаўсюджванне, — падкрэсліў Уладзімір Русакевіч. — Мы самі, без пасрэднікаў, павінны расказваць усяму свету пра Беларусь, пра нашу палітыку, эканоміку, пра жыццё. Няхай чытач мае розную інфармацыю, няхай сам выпрацоўвае ўласную думку».

Кабельнае вяшчанне ў малых гарадах Віцебскай вобласці запланавана арганізаваць у бліжэйшы час. Размова ідзе аб павелічэнні колькасці тэлеканалаў у горадзе Мёры Віцебскай вобласці, дзе не прымаюцца расійскія каналы, але прысутнічаюць літоўскія і латышскія. Кабельнае вяшчанне дамах раённага цэнтра. У малапавярховых дамах і прыватным сектары прыём сігналу магчымы толькі з зямных эфірных станцый, якія рэтрансліруюць толькі айчынныя тэлепраграмы.

Папулярнасць беларускіх выканаўцаў апошнім часам вельмі ўзрасла ў тым ліку і за кошт увядзення нормы трансляцыі ў эфіры 75 працэнтаў айчыннай музыкі. Увядзенне нормы 75 працэнтаў дало магчымасць адкрыць таленты, дапамагчы многім прабіцца наверх. Некалькі гадоў таму не так шмат беларускіх артыстаў былі папулярныя і вядомыя, хоць цалкам заслугоўвалі гэтага. Цяпер сітуацыя змянілася, айчынная эстрада стала вядомай і запатрабаванай.

Міністэрства інфармацыі Беларусі ў 2007 годзе вынесла папярэджанні 76 перыядычным выданням, адзначыў Уладзімір Русакевіч.

Паводле дзеючага заканадаўства Міністэрства інфармацыі мае права выносіць папярэджанні і прыпыняць дзейнасць друкаваных СМІ на тэрмін да трох месяцаў. Што датычыцца закрыцця сродкаў масавай інфармацыі, то гэта справа судовых органаў, удакладніў міністр. «Я рады, што колькасць папярэджанняў скарачаецца, — сказаў Уладзімір Русакевіч. — Прававая культура журналістаў і кіраўнікоў СМІ значна ўзрасла. Таму такія формы ўзаемаадносінаў, як папярэджанні, гутаркі, прымяняюцца радзей — 3—4 разы ў месяц». Сярод прычын, якія з'яўляюцца падставай для вынясення папярэджанняў СМІ, міністр назваў такія тэхнічныя парушэнні, як перыядычнасць выхаду, мова выдання, заяўленая тэматыка, адрас і іншыя.

Скарачаць набор на спецыяльнасць «журналістыка» не плануецца, паведаміў Уладзімір Русакевіч. Адказваючы на пытанне аб тым, што цяпер падрыхтоўка журналістаў вядзецца ў некалькіх ВНУ краіны, аднак далёка не ўсе дыпламаваныя журналісты ў далейшым жадаюць і могуць звязаць свой лёс з гэтай прафесіяй, Уладзімір Русакевіч адзначыў, што ў бліжэйшы час штогод каля 150 чалавек будуць запатрабаваны ў гэтай сферы. «А тыя характарыстыкі і ацэнкі, якія дае аўтар пытання ў адносінах да журналістаў, можна прымяніць да любой спецыяльнасці. У любой спецыяльнасці хтосьці не прыжываецца, хтосьці перадумаў, хтосьці не хоча працаваць... Гэта датычыцца і іншых сфераў дзейнасці. Таму выдзяляць журналістаў, на мой погляд, не трэба», — сказаў міністр.

На яго думку, прафесія журналіста запатрабавана, і цяпер ідзе размова аб увядзенні новых спецыялізацый на факультэце журналістыкі БДУ. «Журналістыка або інфармацыйная прастора не звужаюцца, а наадварот, пашыраюцца, пастаянна патрабуюць прытоку новых кадраў», — дадаў Уладзімір Русакевіч.

Без супрацоўніцтва факультэта журналістыкі з вядучымі беларускімі СМІ немагчыма добрая падрыхтоўка журналісцкіх кадраў, упэўнены міністр. Пакуль, праўда, гэта супрацоўніцтва «больш праяўляецца на словах, чым на справе». «Мы гаварылі аб майстар-класах, стварэнні вучэбных цэнтраў і лабараторый на базе вядучых СМІ. Пакуль што да гэтага мы толькі падыходзім», — сказаў Уладзімір Русакевіч.

ISSN 1990 - 763X

08078

9 771990 763008

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.04.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 142,00
1 еўра	3 424,31
1 латвійскі лат	4 909,47
1 літоўскі літ	991,64
1 чэшская крона	136,54
1 польскі злоты	1005,11
1 расійскі рубель	91,75
1 украінская грыўня	438,49

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	23,3448
10 UAH	46,7186
1000 BYR	10,8922
EUR	37,2606

Курс у гандлёвых кампаніях (на 23.04.2008 г.)

USD	2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Абзац

■ **Гольф-комплекс адчыніцца ў 2010 годзе пад Мінскам, за два кіламетры на поўдзень ад пасёлка Калодзішчы. У комплекс увойдуць поле для гольфа чэмпіёнскага класа, цэнтр навучання гольфу, гасцінічны і спартыўны комплексы, жылы пасёлак.**

■ Жыхары Лідскага раёна затрымалі злачынцу, які смяротна параніў іх суседку. Зламыснік, 67-гадовы мінчанін, напаў на жанчыну, каб забраць у яе грошы. Ён ведаў, што жыве яна адна, а дзеці наведваюць яе ў выхадныя. Увечары ён пастукаў у дзверы 60-гадовай жанчыны, яна адчыніла і адразу атрымала ўдар нажом у жывот. Жанчына паспела зачыніць дзвярныя запоры і пазваніць дачцэ і суседзям, якія паспяшаліся на дапамогу. Сусед дагнаў злачынцу, але той вырваўся і паласнуў і яго нажом. На дапамогу падаспелі яшчэ двое жыхароў вёскі, якія і затрымалі забойцу.

■ **Лось, які нечакана выбег на дарогу, стаў прычынаў ДТЗ у Браслаўскім раёне. Здарэнне адбылося на дарозе «мяжа Латвіі — Глыбокае — Зэмбін — Лагойск». У выніку сутыкнення жывёліна фактычна лягла на дах аўтамабіля «Аўдзі-6», у якім ехалі муж і жонка з Наваполацка. Лось загінуў. Пацярпелыя людзі ад медыцынскай дапамогі адмовіліся, але назаўтра жанчына адчула недамаганне і была шпіталізаваная з дыягназам закрытая чэрапна-мазгавая траўма. Як адзначаюць у Браслаўскім РАУС, здарэнні з-за раптоўнага з'яўлення дзікіх жывёлін адбываюцца ў раёне практычна кожны тыдзень.**

■ У Нью-Йорку жанчына-паштальён выратавала дзіця, якое выпала з акна. Маці дзяўчынкі ў момант падзення дзіцяці знаходзілася ў іншым пакоі, а яе гадавалая дачка сама выбралася з коечкі і паспрабавала вылезці ў акно. Гэта і заўважыла паштальёнка, падставіўшы дзіцяці рукі.

■ **МНС Кыргызстана прапанавала ўвесці адміністрацыйную адказнасць для СМІ, якія перадаюць няправільны прагноз надвор'я. Адпаведны законапраект быў разгледжаны ў парламенце краіны ўчора. Прадстаўляючы законапраект, наміністра па надзвычайных сітуацыях заявіў, што СМІ часта друкуюць прагнозы крыніц, праўдзівасць якіх не гарантаваная. Адзінай крыніцай, падкрэсліў наміністра, якая ўпаўнаважаная даваць метэапрагнозы, з'яўляецца галоўнае ўпраўленне гідраметэаралогіі пры МНС. Але пры гэтым чыноўнік агаворвае: каб прагнозы Кыргызгідрамета спраўджваліся, неабходна выдзеліць 50 мільёнаў долараў на абсталяванне метэастанцый. Якія меры пакарання чакаюць журналістаў, не агаворваецца. Невядома таксама, ці будуць пакараныя СМІ, калі яны надрукуюць афіцыйны прагноз, а ён не збудзецца.**

■ Скрыпка Страдывары коштам $4 млн, якую забыў у таксі ў Нью-Джэрсі намінант прэміі «Грэмі», вернутая гаспадару. Футарал з інструментам, які выраблены ў 1723 годзе, музыканту вярнуў свядомы шафёр.

■ **Напярэдадні свята Вялікадня на вуліцы Крашчацік у Кіеве размясцілі экспазіцыю плошчай 48 квадратных метраў, якая ўяўляе карту Украіны, створаную з велікодных яек. Для стварэння «велікоднай карты» выкарысталі 17 тысяч вараных яек. На карце размешчаныя Сафійскі сабор, фрагмент крэпасці ў Камянцы-Падольскім, Варанцоўскі маяк, Ластаўчына гняздо і велізарны экспанат музея «Пысанкі» — велікоднае яйка вышынёй 1 метр.**

■ Дом шлюбу ў Сігнаці (Усходняя Грузія) адчынены некалькі месяцаў таму, будзе працаваць кругласутачна. Пара, якая жадае зарэгістраваць свой шлюб пры месяцавым святле, павінна паведаміць аб гэтым за гадзіну да прыбыцця. Кошт рэгістрацыі і атрымання пасведчання аб шлюбе — 9 лары (больш за 6 долараў), а кошт абслугоўвання — каля 35 долараў. Пакуль што гэта адзіная ўстанова ў краіне, дзе ўзяць шлюб можна кругласутачна.

Поўны абзац

■ **Міністэрства культуры і адукацыі Венгрыі прапанавала ўвесці ў краіне падатак на гальштукі. Новы падатак у памеры 0,8 працэнта ад кошту прапанавана браць пры продажы. На думку заканадаўцаў, гальштукі і гальштукі-матылькі ствараюць дызайнеры, якія з'яўляюцца мастакамі, а значыць, іх даходы павінны абкладвацца падаткам для фінансавання мастацтва і культуры краіны.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Нефармат

Па законах жанра. Рэкламнага

Красавік сёлета азнаменаваўся выхадам большай часткі пензенскіх пустэльнікаў на волю. Вакол гэтай падзеі з самага пачатку была арганізавана вялікая піяр-кампанія. Як сказаў адзін з міліцыянераў, якія на працягу больш чым пяці месяцаў неслі вахту ў Паганаўцы-Нікольскім, ахоўвалі пячору нібыта сховішча Цэнтрабанка. Амаль уся вёска здолела добра зарабіць за сезон на здачы пакояў у жылых дамах. Здымалі жыллё, вядома, журналісты. Цэны асабліва падскочылі вясной, калі кожны дзень паяўляліся навіны з падзямелля, а нашага брата-журналіста прыбывала. Адна мясцовая жанчына так растлумачыла інфляцыю на вясковым рынку жылля: «Вы ж разумееце, калі яшчэ такое будзе!»

Сапраўды, такога выпадку, каб не вядомая нікому Паганаўка не больш вядомага Бекаўскага раёна стала славутай на ўвесь свет, складана сабе ўявіць. Ну а дзе вядомасць, слава, там і грошы. Няблага паправіў свае фінансавыя справы тамтэйшы магазін, які журналісцкая грамадскасць праздала «сяльпо». А ўжо ўлады як раённая, так і абласная дэманстравалі небывалую ўважлівасць, чуласць, гуманізм да асобна ўзятай кучкі людзей. Праглядаючы тэлесюжэты і фотарэпартажы, думалася: вось каб так і заўсёды, і да ўсіх. На адным са здымкаў начальнік управлення ўнутранай палітыкі абласной адміністрацыі (аналаг нашага ўпраўлення ідэалагічнай работы) пілуе дровы з манахіняй, якая нядаўна пакінула падземную няволю.

А калі жанчыны праз свайго «духоўнага правадыра» Кузняцова перадалі пажаданне мець карову, віцэ-губернатар Пензенскай вобласці Алег Мельнічэнка адрэагаваў імгненна: «Ды хоць слана! Толькі б усе былі жывыя і здаровыя». Літаральна за дзень-два карова была дастаўлена сектантам. Машынамі ім вазілі прадукты: крупы, алей, макарону. Усё бясплатна. Сам жа Мельнічэнка і гаварыў журналістам, калі сядзельцы выходзілі з пячоры:

— Дзейнічаюць па ўсіх рэкламных канонах. Выходзяць па двое. Не каб адразу...

Гэта віцэ-губернатар каментаваў выхад нашай зямлячкі Іны Вабішчэвіч. Сапраўды, калі нечай злой воляй на кон пастаўлена жыццё і здароўе, асабліва дзяцей, бізнес падыгрываць тут не толькі законам рэкламы. І ўсё ж ці не занадта ўвагі групе людзей, якія добраахвотна ахвяравалі сябе на ліхія прыгоды? Чым больш развівалася піяр-кампанія вакол паслядоўнікаў Кузняцова, тым настойлівей чамусьці ўспамінаўся факт сямігадовай даўніны — пакуты жонкі расійскага афіцэра Бараева, які трапіў у чачэнскі палон. Куды толькі ні кідалася жанчына з просьбамі, патрабаваннямі нешта зрабіць для вызвалення падпалкоўніка, але ніхто не хацеў яе слухаць. Тэлеканалы адмахваліся як ад камерцыйна нявыгаднага праекта. І толькі пасля таго, як ёй усё-такі ўдалося прабіцца на старонкі адной з газет, краіна даведалася пра трагедыю асобнай сям'і. Нехта з калег тады ўедліва-дасціпна заўважыў: «Якая ж тут сенсацыя? Падпалкоўнікаў у нас многа».

Але ж афіцэра на вайну пасылалі, значыць, канкрэтныя асобы павінны адчуваць за яго лёс адказнасць. А людзі ў равок затачылі сябе самі. Як кажуць, адчуйце розніцу. Тут вы можаце мне запярэчыць: радзіма як маці, павінна клапаціцца пра ўсіх сваіх дзяцей, нават блудных. І будзеце мець рацыю. Толькі вось у жыцці не заўсёды так складваецца. Калі праект раскручаны, тады яму — многа ўвагі, калі не — выбачайце.

Што наша жыццё — гульня?! І ў кожнага свая роля. Памятаеце разрэкламаваную сродкамі інфармацыі ад Брэста да Курыл кампанію па сустрэчы першага жыхара новага тысячагоддзя? Ніхто не хацеў адставаць ад калегі — мэра ці губернатара. Кватэры «сыпаліся» градам толькі за тое, што адно дзіця нарадзілася на паўхвіліны раней, чым другое. Вось і наша рэспубліка тады парадавалася за маладых, здаровых мінчан, якія забіралі з раддома першынца разам з ключамі ад новага жылля. Гады тры таму мы ў Брэсце таксама адзначалі нараджэнне 300-тысячнай жыхаркі горада. Таксама была кватэра. На прэс-канферэнцыі з нагоды аўтар гэтых радкоў «даставала» пытаннямі мэра: ці будзе кватэра, калі заўтра народзіцца ў некага трайня ці чацвярня? Тады яшчэ не было заканадаўчага акта аб ільготным крэдытаванні будаўніцтва для шматдзетных сем'яў. Кіраўнік горада элегантна ўхіляўся ад прамога адказу на пытанне.

А нядаўна даведалася пра гора адной самай звычайнай брастаўчанкі. Жанчына, якая ўсё жыццё сумленна працавала на сціплай пасадзе медсястры і больш за дваццаць гадоў будавала свой дом, за нейкую гадзіну засталася без усяго. Дом падпаліла п'яная хуліганка, якую ў свой час гаспадыня прытуліла, пашкадаваўшы. Згарэла ўсё да тла. Жанчына засталася без адзення, без мэблі, без элементарных патрэбных рэчаў. Суд, вядома, прыняў рашэнне абавязаць вінаўніцу выплаціць дзесяткі мільёнаў стратаў. Але ў той — нічагусенькі за душой. Яна не працуе, мае малалетніх дзяцей. Словам, з яе нічога не возьмеш. Кола замкнулася і дапамогі чакаць няма ад кагo. Ад перажытага стрэсу ў Ларысы Анатольеўны здарыўся інфаркт. Цяпер яна пакрысе выкарабкваецца з палону хваробаў, што далей, пакуль не ведае. Яна доўга расказвала сваю гісторыю, гаварыла, што за ўсё жыццё ніколі нічога не прасіла, не мела такой звычкі. Але і не ведала, што чалавек такі неабаронены перад бядой, няшчасным выпадкам, злачынствам. Пра гісторыю Ларысы Анатольеўны я пастараюся расказаць як-небудзь наступным разам.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

НЕВЯЛІКІ ПОМНІК ВЯЛІКАМУ МАЙСТРУ



На доме № 25 па вуліцы Якуба Коласа сталіцы нарэшце адкрылася мемарыяльная дошка славутаму жывапісцу і графіку Валянціну Волкаву (1881—1964 гг.), дзе апошнія 20 гадоў жыў аўтар знакамітага палатна «Мінск. 3 ліпеня 1944 года», а таксама «Штурм Зімняга», «Уся ўлада Саветам», партрэтаў «Кастусь Каліноўскі», «Максім Багдановіч», «Максім Горкі»... Толькі ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі захоўваецца каля 100 жывапісных і больш за сотню графічных твораў Валянціна Віктаравіча.

На цырымоніі ўрачыстага адкрыцця яго вучань, народны мастак Беларусі Георгій Паплаўскі адзначыў: «Адбылася высакародная місія — адкрыўся невялікі помнік вялікаму чалавеку, асобе. Традыцыі рэалістычнага высокага мастацтва майстра прадоўжылі сын Анатоль і ўнук Сяргей».

Даніну памяці і павагі знакамітаму мастаку, той вялікі ўклад у скарбніцу беларускага мастацтва, які ўнёс Валянцін Волкаў сваёй творчасцю, адзначылі старшыня Саюза мастакоў Беларусі Уладзімір Савіч і намеснік старшыні Рыгор Сітніца. Успамінамі пра знакамітага дзеда падзяліўся беларускі мастак Сяргей Волкаў. Аўтар помніка-мемарыяльнай дошкі — заслужаны дзеяч мастацтваў, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР скульптар Міхаіл Заспіцкі.

Марыя ЖЫЛІНСКАЯ, фота аўтара.

Твае правы

«МІНІМАЛКА» БЕЗ УЛІКУ ЗВЫШУРОЧНЫХ

Цяжкасці з «лішнімі» вакансіямі, больш нізкі ў параўнанні з буйнымі гарадамі ўзровень заробкаў, а адсюль — і па-сапраўднаму няпростыя «працоўныя» пытанні. Як аспрэчыць вымову, чаму можа адрознівацца зарплата пастаяннага і часовага работніка ў і што такое «мінімалка»? Усё гэта стала тэмамі чарговай «вызяной прыёмнай» Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, якая была наладжана днямі для жыхароў Касцюковіцкага, Клімавіцкага, Краснапольскага і Хоцімскага раёнаў.

З МЕСЯЦЫ НА СПРЭЧКІ СА СПАГНАННЕМ

Вартаўнік своечасова не зачыніў вароты, за што атрымаў вымову і быў пазбаўлены прэміі. На першы погляд, сітуацыя амаль што звычайная. Калі б не адна акалічнасць: на думку непасрэдна работніка, пакаранне аказалася занадта жорсткім. Бо прычынай «надзвычайнага здарэння» стала... няспраўнасць саміх варот.

— У дадзеным выпадку ёсць толькі адзін варыянт, — адзначае намеснік дырэктара Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Ірына Шыляева. — Незалежна ад першапачатковай згоды або нязгоды з вымовай, работнік на працягу трох месяцаў можа апратэставаць дысцыплінарнае спагнанне ў камісіі працоўных спрэчках сваёй жа арганізацыі ці, калі такой камісіі няма, у судзе. Пры гэтым калі вердыкт камісіі па працоўных спрэчках не задаволіў, то на працягу 10 дзён з моманту ўручэння копіі яе рашэння трэба звяртацца ў той жа суд.

ЯК ПАСПЕЦЬ У СУД?

Рашэнне аб незаконнасці звальнення і аднаўленні на ранейшым месцы прымаецца зноў-такі судом. Прычым звярнуцца сюды неабходна ўжо на працягу месяца. Аднак як укласціся ў іскавы тэрмін з улікам таго, што ў арганізацыі сказалі — выдаць патрэбныя дакументы аб рабоце «на рукі» можна не раней чым праз 15 дзён?

— Заканадаўства аб звароце грамадзян вызначае, што на разгляд заявы і падрыхтоўку адказу адводзіцца да 30 дзён, — кажа Ірына Шыляева. — Разам з тым выдача копій дакументаў аб рабоце — гэта не разгляд заявы. Паводле Працоўнага кодэкса, на прадстаўленне дакументаў аб рабоце і заробках адводзіцца іншы і меншы тэрмін — 5 дзён.

ЗАЯВА ДАЛЁКА НЕ ЎСЁ

Работніку «дадалі» новыя абавязкі. З імі ён не справіўся, таму неўзабаве кіраўніцтва арганізацыі прапанавала напісаць заяву на звальненне па пагадненні бакоў. Заява была напісаная, і ў вызначаны тэрмін работнік проста не з'явіўся на сваё працоўнае месца. Вынікам стала звальненне. Але не па пагадненні бакоў, а... за прагул.

— Каб не патрапіць у падобнае непрыемнае становішча, ні ў якім разе нельга пакідаць сваё працоўнае месца да таго часу, пакуль не з'явіцца загад аб звальненні і работнік не азнаёміцца з гэтым загадам пад роспіс, — зазначае Ірына Шыляева. — Такім чынам, трэба не проста напісаць заяву, але і прасачыць, каб яна была зарэгістравана ў прыёмнай у часопісе «ўваходнай» карэспандэнцыі арганізацыі, да таго ж такі часопіс павінен быць пранумараваным, прашнураваным і скрэпленым пячаткай. А потым варта пацікавіцца, якую ўсё ж рэзалюцыю наклаў на заяву кіраўнік.

Прычым у выпадку нязгоды кіраўніка многае залежыць непасрэдна ад працоўнага дагавора. Калі дагавор быў заключаны на няпэўны тэрмін, трэба адпрацаваць роўна месяц і можна не выходзіць на сваё месца — звольніць за прагул тут ужо нельга. Але калі быў заключаны кантракт, давядзецца дапрацаваць да заканчэння яго тэрміну. Так, варта нагадаць, што спыніць кантракт па ўласным жаданні нельга — зрабіць гэта работнік можа толькі па пагадненні з наймальнікам.

СПРАВА Ў... КАНТРАКЦЕ

Два чалавекі працуюць у адным месцы, па аднолькаваму графіку, маюць аднолькавы разрад і робяць аднолькавыя нормы. Праўда, пры гэтым адзін з работнікаў лічыцца пастаянным, а другі — часовым. Ці могуць іх заробкі адрознівацца амаль у паўтара раза? І ці павінна выдавацца часоваму работніку спецадзенне?

— З часовым работнікам заключаецца працоўная дамова, тады як з работнікам пастаянным можа заключацца кантракт, — працягвае Ірына Шыляева. — А адсюль і магчымыя адрозненні ў заробках: пастаяннаму работніку прадстаўляецца да 50 працэнтаў павышэння тарыфнай стаўкі ці акладу па кантракце, а работніку часоваму — не.

Разам з тым, падкрэслівае Ірына Шыляева, ніхто не можа пазбавіць часовага работніка права на неабходнае спецадзенне. Яно павінна выдавацца нават у выпадку, калі чалавек працуе ўсяго адзін дзень.

НЕСТАНДАРТНЫ ВАРЫЯНТ

Бацька шматдзетнай сям'і, які адпрацаваў на заводзе 7 гадоў, захварэў, атрымаў групу і быў вымушаны звольніцца. А неўзабаве паўстала пытанне аб вызваленні службовай кватэры.

З пункту гледжання заканадаўства раскладка тут такая. Калі прычынай інваліднасці становіцца працоўнае знявечанне, жыллё працягвае заставацца ў карыстанні. Аднак калі інваліднасць настала ад агульнага захворвання, то падстаў для захавання службовай кватэры ўжо няма. Сітуацыя зразумелая і... тупіковая адначасова. Праўда, выйсце з яе прапанаваў старшыня Касцюковіцкага райвыканкама Міхаіл Барысаў — уладкавацца на той жа завод аднаму з іншых членаў сям'і. І, каб не ўзнікала праблем потым, адпрацаваць на прадпрыемстве патрэбныя 10 гадоў.

БЕЗ ПОДПІСУ НЯМА ПРЭТЭНЗІЙ

Не менш цікавы прыклад. Цялятніца адпрацавала месяц і атрымала зарплату... 9 тысяч рублёў. Бо, як высветлілася, з заробкаў былі зроблены вылікі за падзеж жывёлы. Аднак, паводле слоў жанчыны, пры гэтым ніхто так і не паспрабаваў высветліць, што стала прычынай смерці цялят на самай справе. І больш за тое: цялятніцу не пазнаёмілі з самім актам падзяжу.

— Акт падзяжу павінен складацца на кожную галаву, і ў такім акце абавязкова ўказваюцца прычыны надзвычайнага здарэння, — кажа намеснік начальніка ўпраўлення сацыяльна-прававых адносінаў і зарплаты камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Магілёўскага аблвыканкама Ірына Фабрыстава. — А ўжо затым робіцца выснова — хто вінаваты ў смерці цялят і хто тут нясе пакаранне. Пры гэтым падпісаць акт у тым ліку павінна сама цялятніца. Калі ж яе подпісу няма — няма і падстаў прад'яўляць якія-небудзь прэтэнзіі.

БОЛЬШ? З «ДАДАТКОВАЙ» АПЛАТАЙ

Памер аплаты — тэма асаблівая. Чалавек заняты на поўную стаўку, цэлы дзень, выконвае ўсе нормы, а плюс да ўсяго часта працуе звышурочна. Але пры гэтым атрымлівае ўсяго 212 тысяч рублёў. Ці ёсць тут парушэнне заканадаўства?

— Прынамсі, у дадзеным выпадку ўзнікаюць вялікія пытанні, — заўважае Ірына Фабрыстава. — Пры ўмове занятасці поўны дзень і выкананні ўсіх нормаў выпрацоўкі нельга атрымліваць менш за «мінімалку» ці на сёння — менш за 208 800 рублёў у месяц. Прычым варта падкрэсліць: у мінімальную зарплату не «ўваходзяць» звышурочныя, работа ў начны час ці сумяшчальніцтва — усё гэта аплачваецца дадаткова.

Да слова, заробкі на мяжы з «мінімалкай» пры выкананні звышурочных работ з'яўляюцца падставай для звароту ў раённае ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ці ў міжраённую інспекцыю працы. Тое ж можна зрабіць і ў выпадку, калі ў арганізацыі проста не фіксуюцца «перапрацоўкі». Скажам, калі рабочы дзень вадзіцеля фактычна працягваецца з 9 гадзін раніцы да 20 гадзін вечара. Аднак у табелі ставяцца стандартныя «8 гадзін». І менавіта за гэты час налічваюцца грошы. Між тым, зазначае Ірына Фабрыстава, пацвердзіць факт незафіксаваных звышурочных дастаткова складана, але магчыма — у якасці «доказаў» тут могуць выкарыстоўвацца звесткі аб накіраванні на тую ці іншую работу, пуцявыя лісткі ці нават апытанне сярод работнікаў.

Сяргей ГРЫБ,
Касцюковіцкі раён.

1 МАЯ — ВЯЛІКІ КАНЦЭРТ

Як паведаміла прэс-сакратар Федэрацыі прафсаюзаў Вольга Зуёнак, плануецца, што 1 мая ў 12 гадзін на пляцоўцы каля Нацыянальнай бібліятэкі адбудзецца ўрачысты мітынг, а пасля яго заканчэння — вялікі канцэрт з удзелам калектываў «Песняры», «Чысты голас», «Няміга», «Бяседа», арт-групы «Беларусы», груп «Тяни-Толкай», «J: МОРС» і іншых зорак беларускай эстрады.

Буйныя мерапрыемствы пройдуць і ў абласных цэнтрах. 1 мая ў Магілёве прафсаюзы выкупяць частку атракцыёнаў у гарадскім парку — пакатацца на іх усе дзеці змогуць бясплатна. А ў Гомелі будзе наладжаны конкурс дзіцячага малюнка, а таксама інтэлектуальная віктарына на веданне гісторыі прафсаюзнага руху.

Сяргей ГРЫБ.

Спорт-тайм

КАЛІ Б НЕ РЫІСЭ...

У аўторак, 22 красавіка, адбыўся першы паўфінальны матч Лігі чэмпіёнаў паміж «Ліверпулем» і «Чэлсі». На «Энфілдзе» падапечныя Бенітаса выйгравалі да 95-й хвіліны дзякуючы голу Кюйта ў першым тайме. Аднак на апошняй з дабаўленых арбітрам хвілін пасля атакі «Чэлсі» па левым флангу і падачы ў штрафную мяч ва ўласныя вароты зрэзаў нарвежац Рыісэ.

ГЛЕБА ЧАКАЕ ДЫСКВАЛІФІКАЦЫЯ

Падчас матча 35-га тура англійскай прэм'ер-лігі «Арсенал» — «Рэдзінг» — 2:0 беларускі паўабаронца «кананіраў» Аляксандр Глеб ударыў рукой па твары капітана сапернікаў Грэма Мэрці. Рэферы паядынка Пітэр Уолтан гэты момант празяваў і ніякага пакарання не вынес. Аднак англійская футбольная асацыяцыя пачала вывучэнне відэазапісу інцыдэнту. Больш за тое, арбітр матча пасля гульні заявіў, што калі б ён своечасова ўбачыў грубую гульню беларуса, то выдаліў бы Глеба. За такія неспартыўныя паводзіны наш суайчыннік дыскваліфікаваны да канца сезона.

У КУБКУ ІНТЭРТОТА — СУПРАЦЬ ПАЛЯКАЎ

Адбылася жараб'ёўка ўсіх трох раўндаў апошняга ў гісторыі розыгрышу Кубка Інтэртота. У сувязі з рэформай еўракубкаў у наступным годзе гэтага турніру ўжо не будзе. У выніку жараб'ёўкі беларускаму клубу, а гэта будзе або салігорскі «Шахцёр», або жодзінскае «Тарпеда», у першым раўндзе дастаўся ў сапернікі прадстаўнік Польшчы. Пакуль галоўным прадстаўніком ад нашай краіны цікавіцца бронзавы прызёр чэмпіянату-2007 «Шахцёр». У той жа час, калі падапечныя Юрыя Вяргейчыка выйграюць Кубак краны ці выйдуць у фінал разам з БАТЭ, то месца ў Інтэртота атрымае «Тарпеда».

ВЯЛІКІ ХАКЕЙ ДЛЯ НАС ПАЧНЕЦЦА З МАЯ

Авіярэйсам Мюнхен — Манрэаль нацыянальная зборная Беларусі па хакеі прыбыла ў Канаду — месца правядзення 72-га чэмпіянату свету, які стартуе 2 мая. Тут да яе далучыліся 18-гадовы форвард клуба «Квебек Рэмпартс» Міхаіл Стэфановіч і 23-гадовы абаронца «Лэйк-Эры Монстэрс» (АХЛ) Уладзімір Дзянісаў. У праграме канадскага кэмпу — трэніроўкі ў горадзе Лашын паблізу Манрэаля і два кантрольныя паядынкі: 26 красавіка са зборнай Латвіі і 28 красавіка — з камандай Італіі.

Паўкіламетра сетак

Каля вадасховішча Тышковічы Іванаўскага раёна дзяржінспектары Пінскай міжрайінспекцыі аховы жывёльнага і раслінnага свету заўважылі аўтамабіль і побач — трох грамадзян. За 40 метраў ад машыны ў хмызняку была знойдзена гумавая лодка, а за 300 метраў у вадзе — ажно 11 сетак даўжынёй 533 метры. Да таго ж улоў браканьераў ужо склалі 239 асобін розных відаў рыбы. Урон прыродным рэсурсам склаў амаль 9,5 мільёна рублёў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Саковщинский сельский исполнительный комитет Воложинского района Минской области (продавец)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже 2 (двух) земельных участков для индивидуального жилищного строительства:

Лот 1 — земельный участок в д. Саковщина, ул. Юбилейная, площадь участка 0,25 га, начальная цена 6 250 000 белорусских рублей.

Лот 2 — земельный участок в д. Саковщина, ул. Юбилейная, площадь участка 0,25 га, начальная цена 6 250 000 белорусских рублей.

Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание жилого дома. Имеется центральное водоснабжение, имеется в непосредственной близости природный газ. На расстоянии 300 м — река Западная Березина, на расстоянии 5 км — Налибокская пуща. Продажа земельного участка производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории республики или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Задаток в размере 10 % от начальной цены и сбор за участие в аукционе в размере четырех базовых величин перечисляется двумя квитанциями в Главное управление МФ РБ по Минской области РБ, р/с 3600614150142 в филиале № 605 МОУ АСБ «Беларусбанк», код 513, г. Воложин, ул. Партизанская, 13, УНП 600037249, назначение платежа 04901. **Аукцион состоится 24 мая 2008 года в 10.00 по адресу: д. Саковщина, ул. Первомайская, дом 18, кабинет секретаря.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются до 20 мая (включительно) 2008 года до 17.00 по адресу: д. Саковщина, ул. Первомайская, 18, кабинет секретаря.

Контактный телефон (8 01772) 39 1 58.
Минская область, Воложинский район, д. Саковщина, ул. Первомайская, 18
р/с 3604000000482
филиал № 605 МОУ АСБ «Беларусбанк» код 513
г. Воложин, ул. Партизанская, 13

УНП 600037249 ОКПО 44323716000

ОАО «Паритетбанк» (продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» (организатор аукциона)

ПОВТОРНО ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже помещений транспортного назначения (машиномест) в подземной гостевой автостоянке, расположенных по адресу: г. Минск, ул. Гамарника, 9/3.

Номер лота	Номер машиноместа	Общая площадь, кв. м	Начальная цена, бел. рубли	Сумма задатка, бел. рубли
5.	5.	11.9	8 499 992	849 999
9.	13.	12.2	8 714 277	871 428
11.	17.	12.5	8 928 563	892 856
12.	20.	12.5	8 928 563	892 856
14.	22.	12.5	8 928 563	892 856
15.	27.	12.5	8 928 563	892 856
16.	28.	12.5	8 928 563	892 856
17.	29.	11.7	8 357 135	835 714
18.	30.	11.7	8 357 135	835 714
28.	46.	10.2	7 285 707	728 571

Начальная цена каждого лота указана без учета НДС.

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены лота и плата за участие в аукционе в размере 4 базовых величин (140 000 белорусских рублей) перечисляются на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583. Договор купли-продажи между продавцом и покупателем подписывается в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта осуществляется в течение 5 календарных дней с даты подписания договора купли-продажи. **Аукцион состоится 14 мая 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов**. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 13 мая 2008 года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Порядок подачи заявлений на участие в аукционе и порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона. Извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 10.04.2008.

Телефоны для справок: 227 48 36, 227 40 22 — УП «Минский городской центр недвижимости»

УНП 190398583.

ОАО «Минский приборостроительный завод»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже недвижимости, расположенной в г. Минске по пр-ту Независимости, 58:

Комплекса зданий корпусов № 19, № 19а, № 40, общей площадью 7 045,3 кв. м

Начальная цена продажи 27 528 000 000 рублей РБ с НДС.

Задаток в размере 2 % от начальной цены объекта перечисляется на расчетный счет ОАО «Минский приборостроительный завод» № 3012000620011 в филиале ОАО «БПС-Банк» г. Минск, код 334, УНП 100363840.

Порядок проведения торгов оговорен в условиях проведения аукциона.

Аукцион состоится 3 мая 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 58. Заявления и необходимые документы принимаются до 17.00 2 мая 2008 г. по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 58, ком. 603.

Справки по телефону 293 94 40, факс 331 41 97.

■ Дом. Тэл. 8 029 778 33 38.
■ Дом у Мінскім раёне, не далей за 50 км ад Мінска. Тэл. 8 029 558 38 42.

КУПЛЮ
■ Памяшканне пад вытворчасць, склад, офіс, магазін. Тэл. 8 029 682 14 42.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ
по продаже объектов, входящих в состав имущественного комплекса учреждения «Санаторий-профилакторий писателей «Ислочь»

Наименование предмета аукциона	Здания, сооружения и передаточные устройства, входящие в состав имущественного комплекса учреждения «Санаторий-профилакторий писателей «Ислочь»
Местонахождение недвижимого имущества	Минская обл., Воложинский р-н, д. Раков.
Продавец недвижимого имущества	Учреждение «Санаторий-профилакторий писателей «Ислочь»
Характеристика предмета аукциона	**1 лот: Главный корпус** — трехэтажное кирпичное здание, фундамент из сборных ж/б блоков, перегородки кирпичные (облицованные камнем), перекрытия из сборных ж/б плит, крыша мягкая рулонная. Здание оборудовано центральным отоплением, водоснабжением, электроосвещением, вентиляцией, канализацией, радио, телефоном, телевидением; **Жилые дома в двух уровнях (коттеджи № 1, № 2, № 3)** — двухэтажные кирпичные дома, фундаменты из сборных ж/б блоков, перегородки кирпичные, перекрытия из ж/б плит, крыша мягкая рулонная. Здания оборудованы центральным отоплением, водоснабжением, электроосвещением, вентиляцией, канализацией, радио и телевидением; **Финская баня** — одноэтажное кирпичное здание, фундамент из ленточных ж/б блоков, перегородки кирпичные (оштукатуренные), перекрытия из ж/б плит, крыша мягкая рулонная. Здание оборудовано отоплением, холодным и горячим водоснабжением, электроосвещением, вентиляцией и канализацией; **Хозяйственный корпус** — одноэтажное кирпичное здание, включающее в себя: котельную, работающую на твердом топливе, гараж на 6 автомобилей, прачечную, хозяйственно-складские помещения; фундамент из ленточных ж/б блоков, перегородки кирпичные (оштукатуренные), перекрытия из сборных ж/б плит, крыша мягкая рулонная. Здание оборудовано центральным отоплением, водоснабжением, электроосвещением, вентиляцией, канализацией, телефоном; **Здание контрольно-пропускного пункта** — одноэтажное деревянное здание, фундамент бетонный, стены деревянные, перекрытия — деревянные, крыша мягкая рулонная. Здание оборудовано электроосвещением; **Служебное помещение (пристройка к теплице)** — одноэтажное кирпичное здание, фундамент бетонный, перегородки кирпичные, часть конструктивных элементов уничтожено пожаром (крыша); **Овощехранилище** — здание полузаглубленное, обвалованное грунтом; **Канализационная насосная станция** — одноэтажное кирпичное здание; **Комплекс сооружений** — дорожные покрытия, артскважина, насосно-пневматическая установка, резервуары для воды 2х100 м. куб., подъемные резервуары для хранения топлива, иловая площадка, поля фильтрации, канализационный 2-ярусный отстойник, благоустройство, ограждения, малые архитектурные формы, озеленение, металлическая теплица. **Инженерные сети** — сети электроснабжения 0,4 кв. и 10 кв, сети охранной и пожарной сигнализации, сети заземления и молниезащиты, наружное освещение площадки, внеплощадочные и внутриплощадочные сети связи, внутриплощадочный водопровод, водопровод напорной канализации, переливной трубопровод, хозфекальная канализация, тепловые сети. **Справочно:** все объекты 1986 года постройки, земельный участок площадью 17,78 га, ограничения в использовании в охранной зоне р. Ислочь.
Начальная цена единого предмета аукциона, руб.	2 312 583 000 (два миллиарда триста двенадцать миллионов пятьсот восемьдесят три тысячи) белорусских рублей или 1 075 620 (один миллион семьдесят пять тысяч шестьсот двадцать) долларов США.
Сумма задатка, руб.	23 126 000 (двадцать три миллиона сто двадцать шесть тысяч) белорусских рублей.
Организатор аукциона	Госкомимущество, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12, тел. 2881152, 2881156

Аукцион состоится **26 мая 2008 года** в 11.00 по адресу г. Минск, пер. Краснозвездный, 12,

Газета выступіла. Што зроблена?

За неналежнае выкананне службовых абавязкаў — вымова

Людміла і Канстанцін Дрозд з вёскі Леткаўшчына Слуцкага раёна да ўзятага раней у арэнду гектара зямлі хацелі б дадаць яшчэ два гектары. Але ўзнікла праблема з землекарыстальнікам, які фактычна ўхіліўся ад выканання сваіх службовых абавязкаў. Справа замарудзілася, на што і ўказалі заяўнікі ў апытанні чытачоў на тэму дэбюракратызацыі, якое было надрукавана ў «Звяздзе» 28 лютага.

5 красавіка мы зноў вярнуліся да гэтай тэмы. Пад рубрыкай «Рэха публікацыі» быў змешчаны матэрыял «З зямлёй пытанне вырашаецца. А з дэбюракратызацыяй?» Нагодай стаў афіцыйны адказ рэдакцыі са Слуцкага райвыканкама. У ім гаварылася, што пытанне прадастаўлення зямельнага ўчастка плошчай два гектары для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі сям'і Дрозд вырашаецца, грамадзяне з прапанаваным варыянтам згодныя. Але вось ацэнкі з боку раённых уладаў магчымых фактаў бюракратызму, як мы чакалі, лагічна разважаючы на гэтую тэму, не прагучала. Чаму? Такім далёка не рытарычным пытаннем заканчвалася папярэдняя публікацыя.

І вось Слуцкі райвыканкам даслаў нам афіцыйнае рэагаванне ўжо канкрэтна па гэтым баку пытання.

«Пытанні папярэджання ўзнікнення выпадкаў бюракратызму пры разглядзе зваротаў грамадзян па розных пытаннях, уключаючы пытанні, звязаныя з зямельнымі адносінамі, знаходзяцца на асаблівым кантролі ў раённага і сельскіх выканаўчых камітэтаў. Маючыя месца быць факты валакіты, а таксама пытанні выкарынення прычын і ўмоў, што садзейнічаюць парушэнням заканадаўства пры разглядзе зваротаў грамадзян, неаднойчы разглядаліся на пасяджэннях райвыканкама і абмяркоўваліся на нарадах, якія праводзіліся з удзелам кіруючых работнікаў розных узроўняў. Так, канкрэтны факт валакіты, дапушчаны вядучым спецыялістам землеўпарадкавальнай і геадэзічнай службы Слуцкага раёна А.А. Мяцельскім па звароту гр. К.К. Дразда, што быў выкладзены ў артыкуле «Жыць стала зручней» у газеце ад 28.02.2008 года, таксама абмяркоўваўся на нарадзе, праводзімай 12.03.2008 года са спецыялістамі вышэйуказанай службы і 19.03.2008 года — на нарадзе-вучобе, праводзімай з работнікамі, што выконваюць адміністрацыйныя працэдуры па зваротах грамадзян.

За неаднаразовыя дапушчэнні неналежнага выканання службовых абавязкаў вядучаму спецыялісту землеўпарадкавальнай і геадэзічнай службы Слуцкага раёна А.А. Мяцельскаму аб'яўлена вымова (загад № 65-к ад 25.03.2008 года).

Дадаткова паведамляем, што зараз спецыялістамі УП «Праектны інстытут «Белгіпразем» ужо праведзены абмер зямельнага ўчастка, які перадаецца гр. К.К. Дразду ў арэнду, і рыхтуюцца матэрыялы па распрацоўцы праекта адводу вышэйуказанага зямельнага ўчастка».

Сяргей РАСОЛЬКА.

Прамая лінія

АБАРОНЦА КАСЦЕЙ — КАЛЬЦЫЙ-Д3

На пытанні адказвае загадчыца кабінета астэадэнсітаметрыі Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння Наталля ВАСІЛЬЕВА

(Заканчэнне. Пачатак у нумарах за 16—18, 23 красавіка.)

☎ — Зінаіда Васільеўна са Стоўбцаў. Мне 57 гадоў. Чатыры гады таму перанесла аперацыю на шчытападобнай залозе. Пасля гэтага ў мяне выявілі пачатковую стадыю астэапарозу. Падкажыце, як можна дадаткова абследавацца і атрымаць лячэнне ў Мінску?

— У вас — зніжэнне коснай шчыльнасці, якое называецца астэапеніяй, і абумоўлена гэта, хутчэй за ўсё, узростам. Гэта яшчэ не хвароба. Зараз вам патрэбна прафілактыка астэапарозу. Калі вы хочаце прайсці дадатковае абследаванне, то можаце ўзяць накірунак на ўрача-эндакрынолага ў наш цэнтр, на Макаёнка, 17. Або можаце запісацца на дэнсітаметрыю і абследавацца платна. Пакуль вам дастаткова будзе прымаць прэпараты кальцыю і вітаміну $Д_3$.

☎ — Мяне завуць Міхаіл, тэлефаную з Мінска. Ці варта прафілактаваць астэапароз з дапамогай глюканату кальцыю або яечнай шалупайкі?

— Глюканат кальцыю — гэта зусім не тое, што патрэбна ў дадзеным выпадку, паколькі ў гэтай солі кальцыю ўтрымліваецца ў 5 разоў менш, чым у карбанаце. А што датычыцца яечнай шалупайкі, то цяпер прадаюцца цудоўныя камбінаваныя прэпараты, якія ўтрымліваюць кальцый у той форме, у якой ён будзе засвойвацца — з вітамінам $Д_3$. Ужывайце іх, калі ласка, на здароўе.

☎ — Мінск, Тамара Пятроўна. У нашага 70-гадовага дзеда быў пералом шыйкі сцягна. Зрабілі аперацыю, зараз ён ходзіць. Прымае структум. Скажыце, колькі часу яго варта прымаць?

— Рэкамендаваная працягласць курсу лячэння складае 6 месяцаў. Дзеда трэба накіраваць на дэнсітаметрыю, каб замераць узровень кальцыю ў касцях. Пасля абследавання пры неабходнасці можна будзе правесці карэкцыю лячэння. Вашаму дзядулі неабходна правільна харчавацца, уключаць у рацыён агародніну (рэпу, капусту, пятрушку, кроп, сельдэрэй). Яму трэба як мага даўжэй бываць на паветры, на сонцы, хадзіць па магчымасці.

☎ — Турбуе Пухавіцкі раён. Лідзія Паўлаўна. Матулі — 84 гады. У яе баліць нага. Дыягназ — правабаковы коксартроз з выражаным болевым сіндромам, з парушэннем функцыі тазасцегнавога сустава, парэз чатырохгаловай мышцы сцягна, пазваночны спандылаартроз. Як з гэтым змагацца?

— Пытанне аб аператыўным лячэнні вырашае хірург-артапед. У дадзеным выпадку патрэбны прэпараты для абязбольвання. Участковы ўрач з улікам іншых захворванняў прызначыць вашай маці патрэбныя анальгетыкі.

☎ — Ірына Уладзіміраўна з Валожына. Ці варта жанчыне 70-гадовага ўзросту раз у паўгода праводзіць лячэнне астэапарозу мукасатам?

— Прэпарат мукасат ніякага дачынення да астэапарозу не мае. Ён дапамагае храсткам, а мы гаворым пра косці. Астэапароз лечыцца зусім інакш.

☎ — Брэст, Святлана Вікенцьеўна. Мне зараз 51 год. Скажыце, мне варта прымаць кальцый?

— Жанчынам ва ўзросце пасля 50-і ў суткі патрэбна 1500 мг кальцыю і 800 адзінак вітаміну $Д_3$. Хутчэй за ўсё, з прадуктамі вы столькі не атрымліваеце.

— А кальцый можа не засвойвацца?

— Без вітаміну Д так і адбываецца. Ён неабходны для добрага ўсмоктвання кальцыю і нармальнага коснага абмену.

— А якія рэчывы могуць перашкаджаць засваенню кальцыю?

— У першую чаргу фосфар, які ўтрымліваецца ў напоях накшталт «Пепсі». Лішак ужывання солі з ежай прыводзіць да зніжэння шчыльнасці коснай тканкі, а таксама трэба абмяжоўваць кафеін. Патрэбна займацца фізічнымі практыкаваннямі, больш рухацца і хадзіць пешшу!

«Прамую лінію» правялі Святлана БАРЫСЕНКА і Вольга ШАЎКО.

ПЯРУН І ЛЁЛЯ ПАД БАРАНАВІЧАМІ

Пярун, Дажджбог, Вялес, Зюзя... Які пантэон дахрысціянскіх багоў!

Вялікі пласт міфалогіі, нашай культуры многімі ўжо забыты

На тэрыторыі Баранавіцкага Цэнтра рамёстваў праходзіў абласны пленэр «Беларуская міфалогія ў манументальнай скульптуры». Сюды прыехалі разьбяры па дрэве не толькі з Брэстчыны, але і суседняй Гродзеншчыны. Народныя майстры павінны былі выразаць язычніцкіх багоў, якія і застануцца назаўсёды тут — утвораць своеасаблівы пантэон. Не ведаю, як у іншых рэгіёнах, але на Брэстчыне так шырока яны прадстаўлены ўпершыню.

На пленэры сваё майстэрства паказалі дзевяць майстроў — сямёра з розных раёнаў сваёй вобласці і двое з Гродна. Большасць з іх ужо вопытныя разьбяры і пабывалі на дзесятках падобных мерапрыемстваў, ім даводзілася займацца аздабленнем цэркваў, грамадскіх устаноў, паркаў, працаваць на радзіме знакамітых людзей, напрыклад, Напалеона Орды, ці афармляць у народным стылі звычайную карчму. Сякерай, долатам, як і электрапілой, майстры валодаюць дасканала, і назіраць за іх работай — адно захапленне. За працу над язычніцкімі багамі майстры ўзяліся з задавальненнем, бо як давялося пачуць, гэта творчая работа і кожны мог выбраць сабе бога, які найбольш па душы.

Валерый МАНЦЭВІЧ і яго Вялес.

Іван Супрунчык са Столінскага раёна — вядомы народны майстра і сваю Каляду высек адной сякерай. Іншых інструментаў ён не прызнае.

— Сапраўды, майстра павінен абыходзіцца сякерай. Некалі толькі так і працавалі, — кажа Супрунчык. І гаварыў гэта ён не ў крыўду іншым, бо літаральна ў метры ад яго рэзаў Вялеса яго калега з Драгічынскага раёна Валерый Манцэвіч. Ён самы малады на пленэры і любіць тонкую работу, а тут без долата не абысціся. Чаму выбраў Вялеса? А з той прычыны, што гэты бог заступнік жывёлы і птушак. У Валерыя толькі трэці пленэр, а ў Супрунчыка, можа, трыццаты — усе майстра не можа ўспомніць. В. Манцэвіч працуе ў Антопальскім Цэнтры рамёстваў і марыць з часам адкрыць сваю справу, звязаную з разьбой па дрэве, бо навошта мяняць прафесію, якую набыў у Кобрынскім прафесійна-мастацкім вучылішчы.

Сярод удзельнікаў пленэру Ірына Кашнярук — адзіная жанчына, яна чаравала над Дажджбогам. На першы погляд неяк нязвыкла бачыць жанчыну з долатам ці электрапілой, але, панаазіраўшы за яе працай, ужо не прыкмячаеш гэтага. Ірына ні ў чым не саступае калегам і яе бог сапраўды свеціцца цяплом, праменіцца сонцам. У свой час Кашнярук працавала ў Нацыянальным парку «Белавежская пушча», яе творы знаходзяцца ў мясцовым музеі, Ірына зрабіла роспісы і ў рэстаране парку.

Над Перуном карпеў Мікалай Скляр, і мне падалося, што бог атрымліваецца дужа дабрадушны і хоць трымае маланку, але чымсьці пераклікаецца з Несцеркам.

— А хто Перуна бачыў? — спытаў разьбяр. І сапраўды, ніхто яго не бачыў, але я ў дзяцінстве чуў, калі яшчэ не было асушана Палессе, як грымеў Пярун. Бывае, як лясне, то жанчыны хрысціліся і цалавалі абразы, а дзеці хаваліся пад ложак. Сёння гэты бог ужо згубіў былую сілу.

Па ўсёй тэрыторыі Цэнтра рамёстваў працавалі майстры — па адным ці, крыху ўбаку, пацелі над асінавымі калодамі ўдвух.

Анатоль Туркоў з электрапілой шчыраваў над Зюзяй, а за метр ад яго заканчваў Цёцю Валянцін Багдзевіч.

Ірына КАШНЯРУК з Дажджбогам.

Мужчыны ўжо сталага веку, і я зразумеў, што жыццё ў іх склалася. І хоць сёння ў многіх мастакоў ёсць праблемы з заказамі, А. Туркоў у Камянцы запатрабаваны. Калі там праходзіла свята беларускага пісьменства, ён прымаў у афармленні райцэнтра самы актыўны ўдзел. Скульптура Ефрасінні Полацкай, якая стаіць каля Вежы, — яго твор. В. Багдзевіч з Гродна ў свой час 16 гадоў адпрацаваў у мастацкай майстэрні, а сёння займаецца стварэннем парку ў вёсцы Каробчыцы. Гродзенскі мясакамбінат вырашыў узвесці там зону адпачынку накшталт вядомых «Дудутак» і фінансуе работы.

Разьбяры, як мне падалося, на лёс не наракаюць. Некаторыя з іх — сябры Саюза народных майстроў Беларусі, кіраўніцтва якога стараецца, каб арганізацыя жыла творча. З гэтай нагоды арганізоўваюцца падобныя пленэры не толькі на Беларусі, але і за мяжой. І майстры лічаць, што вельмі важна падтрымліваць кантакты між сабой.

Акрамя пералічаных багоў, сярод бяроз каля ветрака будзе стаяць Лёля, якую выразаў Уладзімір Чыквін з Кобрына, знойдзе сваё месца і Жыцень будаўніка Вячаслава Дароцькі і напэўна ж не застанецца без увагі твор Аляксандра Лазеркі. Майстра растлумачыў, што ён выразаў бацьку багоў — Белуна.

Заканчваючы размову, скажу, што гэты пленэр паказаў, як многа залежыць ад мясцовай улады. Райвыканкам падтрымаў задуму дырэктара цэнтра Міхася Берната, народных майстроў сабрала загадчыца аддзела традыцыйнай культуры абласнога грамадска-культурнага цэнтра Ларыса Быцко, а там падключыўся лясгас і даставіў бярвенні ў абхват...

Наведвальнікі Цэнтра рамёстваў будуць глядзець на старадаўніх багоў, а тыя — на людзей, і можа ў кагосьці ўзнікне пачуццё прычынення да мінулага...

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Здарэнні, крымінал

СМЕРЦЬ АД... МАГНІТАФОНА

У гарадскім пасёлку Карма загінуў малады хлопец. Спрабуючы ўключыць магнітафон, ён дакрануўся рукой да аголенага праводу і быў смяротна траўмаваны.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ЗА РУЛЁМ — БЕЗ ПРАВОЎ

18-гадовая навучэнка аднаго з ПТВ на аўтадарозе Орша — Магілёў у Аршанскім раёне, знаходзячыся за рулём «Фольксваген-Гольф», не справілася з кіраваннем, выехала на паласу сустрэчнага руху і ўрэзалася ў «Мерседэс-Бенц». У выніку гэтага ДТЗ навучэнка была траўмавана, а яе 28-гадовы пасажыр загінуў на месцы аварыі. Высветлілася, што кіроўца не мела вадзіцельскага пасведчання.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ВЫРАШЫЎ ПЫТАННЕ ЗА $1100

У Свіслачы супрацоўнікі ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю па Гродзенскай вобласці затрымалі 40-гадовую адказную асобу Свіслацкага ўнітарнага камунальнага прадпрыемства бытавога абслугоўвання насельніцтва.

Падазраецца гэты мясцовы жыхар у тым, што за станоўчае вырашэнне пытання аб заключэнні дагавора арэнды памяшкання атрымаў ад індывідуальнага прадпрымальніка, жыхара Мінска, хабар у памеры 1100 долараў ЗША.

Дзмітрый СТАНКОВІЧ.

У ПАДАРУНАК — ТУЮ. З КАРАНЯМІ

Вясна абудзіла ў некаторых маладых людзей такі настрой, такі прыліў натхнення, што яны гатовыя падарыць сваім каханым не толькі кветкі, але і... дрэвы. Так здарылася з адным гамяльчанінам, які, падмацаваўшыся спіртным, вырваў з каранямі з газона вуліцы тую і ўручыў яе даме сэрца, якая прыняла гэты незвычайны і экзатычны падарунак з хваляваннем і радасцю. Але «эксперыментатар» трапіў у поле зроку міліцыі. Тое дрэўца ён пасадзіў на сваё месца, а яшчэ заплаціў штраф у памеры дзесяці базавых велічынь. А гэта — 350 тысяч рублёў. Колькі ружаў можа было купіць на гэту суму!

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ТАКСІСТ ДАПАМОГ ЗАТРЫМАЦЬ ЗЛАЧЫНЦУ

Як паведаміў намеснік начальніка УУС Гродзенскага аблвыканкама Іван Рыбак, каля вёскі Саволеўка Гродзенскага раёна пасажыр таксі пад пагрозай прадмета, падобнага на пісталет, завалодаў ключамі ад аўто і выпіхнуў вадзіцеля з машыны, папярэдне выкінуўшы батарэйку з яго мабільнага тэлефона.

Таксіст, які ехаў на сустрэчным кірунку, убачыў знаёмую машыну, патэлефанаваў калегу, каб даведацца, куды той накіроўваецца (да таго часу пацярпелы знайшоў выкінутую батарэйку, уключыў свой тэлефон і выклікаў міліцыю). Ён развярнуў машыну і паехаў за злачынцам, паведамляючы міліцыі аб яго месцазнаходжанні. Каля вёскі Ганчары Лідскага раёна нарад ДАІ затрымаў зламысніка. Ім аказаўся 24-гадовы хлопец у стане алкагольнага ап'янення.

Кар. БЕЛТА.

НЕМЕЦКИЕ ТЕХНОЛОГИЯ И ОБОРУДОВАНИЕ
Лиц.№ 5498 от8.04.2004-09г. выд. МГИ.
УНП 100797749
ПРОИЗВОДСТВО ПЕНОПЛАСТА
всех марок и толщин
Реализация частным лицам и организациям
Доставка
ООО "ЭУХАРИС" г. Минск
8(029) 674-47-31
Т/ф 8(017) 228-27-73, 228-29-07
Производство сертифицировано

МІЛЬЯРД ДОЛАРАЎ

Менавіта такога аб'ёму тавараабароту паміж Беларуссю і Ніжагародскай вобласцю вырашылі дасягнуць у недалёкай перспектыве ўдзельнікі пасяджэння Савета дзелавога супрацоўніцтва, якое адбылося 21 красавіка ў Магілёве.

Перадумовы для гэтага ёсць: летась тавараабарот паміж нашай краінай і гэтым расійскім рэгіёнам павялічыўся амаль у 1,5 раза і дасягнуў 600 мільёнаў долараў.

Дэлегацыя расіян, якая прыбыла ў Магілёў, налічвала 40 чалавек. У пасяджэнні Савета дзелавога супрацоўніцтва бралі ўдзел першы намеснік старшыні ўрада Ніжагародскай вобласці Віктар Клочай, намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Андрэй Кабякоў, старшыня Магілёўскага аблвыканкама Барыс Батура.

Ніжагародская вобласць — асноўны партнёр Беларусі сярод расійскіх рэгіёнаў. Наладжаны шырокія і рознабаковыя сувязі. Ніжагародцы набываюць у беларусаў рухавікі і аўтакампаненты, шыны і сельскагаспадарчую прадукцыю. Беларусь закупляе ў ніжагародцаў аўтамабілі і аўтобусы, рознае абсталяванне, палімеры.

У Ніжагародскай вобласці створана і працуе сумеснае прадпрыемства па вытворчасці ліфтоў на базе вядомага магілёўскага завода.

Каб захаваць тэмпы развіцця ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, расіяне зрабілі некалькі прапаноў беларускім партнёрам. Напрыклад, стварыць сумесную вытворчасць з МАЗам і набыць для водных транспартных сістэм сучасныя судны. Таксама ніжагародцы прапанавалі паслугі сваёй інжынірынгавай кампаніі ў сферы атамнай энергетыкі.

Андрэй Кабякоў і Віктар Клочай падпісалі план мерапрыемстваў на сёлета.

Ілона ІВАНОВА.

ДОБРЫЯ ЛЮДЗІ

КАСІРКА І VITTEL

Разважаючы пра краму народнага адзення Zara, Бегбедэр зрабіў прапанову: забараніць багатым людзям апранацца ў Zara. Сапраўды, калі чалавек мае сродкі, ён мусіць спраўляць абновы ў шыкоўных буціках, а не лезці падчас распродажу за танным швэдрыкам. Тое самае можна сказаць і пра рэстарацыі... Заможным трэба абмежаваць уваход у народныя сталоўкі, кшталту Lido ды McDonald's! Трэба паставіць ахоўнікаў з заданнем — багатых не прапускаць. Толькі тут адна праблема, бо гэты багацей паспеў, гад, купіць сабе швэдрык у Zara, а на твары ў яго не напісана, колькі грошай мае на картачцы. Але ён усё адно сябе выдасць, як я выдаў сябе ў віленскім Lido. Паставіў на спод талерку з рысам і гародніна ды бутэлечку вады Vittel. Падышоў да касіркі. На мне шэры ў палосы швэдрык ад Zara. А тут і пачалося: «Вы што? Вы будзеце піць гэтую ваду за 4 літы? Ідзіце і пастаўце на месца! У нас такой вады поўна, такой і не дарагой! А гэта простая вада, нават без газу, а каштуе ажно 4 літы! І хто толькі прыдумаў простую ваду прадаваць за такія грошы? Вы што, лянуецеся схадзіць па ваду? Я магу схадзіць, а Вы тут касу павартуйце...» — «Не трэба; я, з вашага дазволу, вып'ю ваду за 4 літы». — «Ну і чалавек! Я яму прапаную быць разумным, а ён яшчэ і ўпіраецца... Не разумею я такіх!» Касірка, відавочна, закрыўдавала на мяне. Ну і я на сябе зазлаваўся. Якога ражна папёрся ў Lido? Хіба мала ў Вільні рэстарацыяў, дзе ніхто цябе не спытае пра выбраную ваду? Ды процьма тых рэстарацыяў, але там дачэпяцца да рысавай кашы, пачнуць прапаноўваць да той кашы аленя з шакаладнай поліўкаю ці каплуна, запечанага на вуглях. Карацей, лепей за маю домработніцу ніхто не гатуе, але і яна, калі злуецца, кажа: «Вы што, мяса сабе шкадуеце? Чаму ўвесь час я гатую вам зялёнае бацвінне?»

РЭНЯ І «ПЕТУШОК»

У горадзе Сочы жыве мая цётка, родная цётка Рэня. Неяк, ад няма чаго рабіць, я сеў і палічыў, колькі пражыў у Рэгіны, атрымаўся цэлы год. Вялікі, суцэльна летні год я прагуляў на беразе Чорнага мора, сярод платанаў і бананавых дрэў. Таму я абсалютна не хваляваўся, калі ў сне прыляцеў на самалёце ў тыя Сочы. У аэрапорце я зайшоў у кнігарню, дзе і пазнаёміўся з тамтэйшым аматарам букіністычных выданняў. Мы загаварылі пра літаратуру, а потым і пра мову. Высветлілася: букініст — беларус. Ён паскардзіўся, што ў Сочы няма з кім пагаварыць па-нашаму. Я паспачуваў. Дарма! Нашае знаёмства мы вырашылі адзначыць у бары «Петушок». Мы ішлі ў бар па незнаёмай мне вуліцы і завярнулі ў нейкі тупік. У тупіку новы знаёмы прапаў, знік, як пад зямлю праваліўся. Я хацеў быў выйсці з тупіка на вуліцу, але дарогу загарадзілі бандзюкі. Іх было чалавек шэсць-сем. Адзін з іх схапіў мяне за шыю, а другі так моцна ўдарыў у твар, што я ажно прачнуўся... Пакуль прачынаўся, я яшчэ паспеў пашкадаваць свой дарагі гадзіннік, які збіраліся адабраць бандзюкі, а яшчэ паспеў праклясці сочынскага беларускамоўнага букініста. У сне шмат што паспяваеш зрабіць за адно імгненне. Прачнуўшыся, я задумаўся... Якога чорта я павалокся ў бар «Петушок»? А якога ражна я вечарам павалокся ў рэстаран «0,5»? Выпадкова. Выйшаў прайсціся, сустрэў Віцьку, мянушка Банкір, і Сяргея, мянушка Нарзан. Яны захацелі выпіць гарэлкі, і мы пайшлі ў «0,5». Нарзан з Банкірам замовілі гарэлку і салаты, а я — гарбату чорную. Музыка... Ну, тое, што выконвалася на музычных інструментах у «0,5»... Тое, што павінна быць вясёлым і лёгкім, было гучным, цяжкім і безнадзейным. Музыка рэстаранных лабухаў безнадзейная, у сутнасці сваёй безнадзейная. Калі вып'еш гарэлкі, ты гэтага не пачуеш, а на цвярозую галаву — чуваць. Тут яшчэ дзеўкі з'явіліся. Каб я выпіў гарэлкі, яны б папрыгажэлі, а так яны былі прыгожыя толькі для Банкіра і Нарзана. Я развітаўся і пайшоў спаць, і прысніўся мне горад Сочы... Дарэчы, даўно я не тэлефанаваў Рэгіне! Як там яна? Трэба затэлефанаваць. А можа, злётаць на пару дзён? Затэлефанаваць трэба абавязкова, толькі не ў пяць гадзін раніцы. А пятай раніцы варта яшчэ спаць. І я засынаю, а перад тым як заснуць, уяўляю сочынскі тупік з бандзюкамі. Яны зноўку пераймаюць мяне на дарозе. Адзін хапае за шыю, а другі намерваецца ўдарыць. Ха! У мяне ў руцэ сякера, такая невялічкая сякера для рассякання мяса. Я з усяе моцы сяку нагу таму бандзюку, што ўчапіўся ў маё горла. Лязо глыбока заходзіць пад калена. Бандзюк скурчваецца. Я вызваляюся і сяку другога па галаве, за вухам. А што ж яны сабе думалі? Што не вярнуся? Мой сон, хачу — прахопліваюся, а хачу — і вяртаюся, прыхапіўшы сякеру.

ЯДЗЯ І «ФРЭСКІ»

Дачка робіць кулінарную кнігу. Знакамітыя людзі гатуюць улюбёную страву, распавядаюць гісторыі, адкуль даставаліся рэцэпты, а Ядзя фатаграфуе і запісвае. Просценькі праект, які будзе трымацца на вядомасці кухараў-аматараў. Што ні кажы, а добра, калі дзеці нейкім чынам працягваюць справу бацькоў, у маім варыянце — робяць кнігі. У рэстарацыі «Фрэскі» мы з дачкою ядзім сушы і разважаем пра кулінарны праект. Ад кнігі пераходзім да абмеркавання якасці рысу ў сушы. «Самае цяжкае ў сушы — правільна зварыць рыс», — кажа дачка. «Праўда? А я думаў: у сушы галоўнае — свежасць прадуктаў». — «Ага! Толькі гэта не пра сушы ў Менску. У Бостане, у японскай рэстарацыі я замовіла амара. Кухар прыгатаваў яго так, што трэба было есці амара ў той час, як ён яшчэ варушыў клюшнямі...» — «Смачны быў амар?» — «Свежы!»

ЦЯЖАРНАЯ І ТАТУІРОЎКА

Каралеўскай хадою яна спускалася ў метро. У большасці цяжарных жанчын у пасцаве з'яўляецца значнасць, упэўненасць, арыстакратычнасць. Высокая, загарэлая, яна несла папарадзе сябе вялікі жывот, шчыльна абцягнуты белай майкаю, а на плячы ў яе красавалася круглая татуіроўка з тварам сонца. І мне ўявілася нованароджанае дзіця з блакітнай татуіроўкаю на маленечкім плячы.

ТАМАРА І ГУЗІКІ

У стракатым натоўпе я ўбачыў Тамару, сваю першую жонку. Яна была элегантна-чорная, як заўжды. Я схапіў Тамару за руку. Так я заўсёды раблю, каб яна не ўцякла. Не схаплю — і пачне ўцякаць, а ты даганяй-лаві. Цяпер яна ўжо ведае пра мой суворы намер пагаварыць і не ўцякае, стаіць і ягамосна пасміхаецца. «Куды ты, Тамара Іванаўна, кіруешся?» — «Нікуды!» — «Адкуль ты, Тамара Іванаўна, ідзеш?» — «Ніадкуль!» — «Як ты жывеш?» — «Добра!» — «Як дачка?» Знарок не кажу «наша», бо для Тамары наша дачка — толькі яе дачка. «Таксама добра!» — «Працуе?» — «Працуе!» — «Дзе?» — «Табе назву фірмы сказаць, ці проста яе спецыяльнасць?» — «Яна, як разумею, працуе па сваёй спецыяльнасці?» — «Працуе ў камп'ютарнай фірме...» — «Ёй падабаецца?» — «Не падабаецца. Ёй не падабаецца сядзець восем гадзін на адным месцы...» І мне ніколі не падабалася сядзець восем гадзін на адным месцы. «Чаго мы стаім? Ты куды ішла? Я цябе правяду...» — «Я іду ў ГУМ па гузікі...» — «Пайшлі ў ГУМ па гузікі...» Мы ідзем у краму па гузікі, і я моцна трымаю Тамару за руку. «Табе што, таксама трэба гузікі?» — «Не, мне гузікі не трэба. Мне трэба карціны. Я зноў малюю карціны...» — «Ты малюеш пэндзлямі на палатне?» — «Менавіта пэндзлямі на палатне я малюю голых жанчын!» — «Гэта ўсё памерла яшчэ ў мінулым стагоддзі. Намаляваныя на палатне жанчыны нікому не трэба. Табе проста няма чаго рабіць, і ад няма чаго рабіць ты малюеш нікому не патрэбных голых жанчын!» — «Часам мне за маюнкі плацяць. Мала, але плацяць... А ты што, шыць пачала, што гузікі спатрэбіліся?» Тамара пяшчотна пагладжвала чорны гузік. «Мне трэба такі, толькі без узораў, а без узораў у іх няма...» — «Тамара Іванаўна, хочаш я куплю табе гэтыя гузікі?» — «Купі іх сабе!» — «А мне не трэба, у мяне ўсё ёсць!» — «Усё ёсць, як у каньяка Крышталь?» Я сумеўся, я не ведаў, што казаць, я нічога не чуў пра каньяк «Крышталь». «Тамара, я не ведаю такі каньяк. Тамара Іванаўна, я так даўно не п'ю, што не ведаю назвы сучасных каньякоў!» — «І зараз ты цвярозы?» — «Канешне!» — «Ты цвярозы прыйшоў глядзець гузікі? Так я табе і паверыла...» Сапраўды, паверыць, што цвярозы чалавек, які два гады не бачыў сваю былую жонку, пайшоў з ёю ў краму разглядаць гузікі, — цяжка. Але я цвярозы, і я стаю ў краме, і я трымаю яе за руку. Трэба адпускаць. Я адпусціў руку Тамары Іванаўны. Яна ўзрадавалася. «Для цябе, Тамара, я заўсёды п'яны. Нават калі я крыштальна цвярозы, для цябе я застаюся п'яным». Яна не адказала. Яна знікла ў стракатым натоўпе.

Адам ГЛОБУС.

Простая мова

Шчасце — гэта...

Ці не першы ўспамін, з маленства? Свята на вуліцы. Я — дома і чамусьці адна, — мама пайшла на фэст. Значыць, адтуль, ну напэўна ж, прыйдзе з гасцямі?

Чакаючы іх, я падцягваю да стала табурэткі, зношу талеркі-відэльцы, чышчу... селядцы.

Што ў дзіцяці гадоў трох-чатырох з гэтага магло атрымацца, уявіць не цяжка. Цяжка, мусіць, было ўбачыць, бо мама, адразу, з парога, стала сварыцца. Нават набіла б... Калі б не госця (бабуліна сястра), што ўсё-ткі прыйшла!.. І засланіла. Сабой...

Тым самым паказаўшы, якое ж гэта шчасце, калі хоць нехта бачыць не толькі тое, што ты зрабіў (умоўна — з тымі селядцамі, з новай сукенкай, з чыстым настольнікам), але і тое, што хацеў...

Таму — ізноў — што бачу...

Бабам — цікава

Універмаг. Аддзел бялізны — прычым мужчынскай, але ж ля прылаўка і тут выключна мы, бабы. У сэнсе — жанчыны. Чацвёрка нас. Напярэдзе — самая маладая. Гадоў, мо, 30... Трусы выбірае.

— Мне — на 50-ы памер. Вось такія, такія... Вунь такія яшчэ, — камандуе яна, тыцкаючы пальцам у вітрыну. Прадавачка зважае, падае: праз хвілю прылавак — літаральна — усцелены.

— Усе паказалі? — удакладняе маладзіца. — Тады я бяру: гэткіх (зноў паказвае пальцам) — двое, гэткіх — трое, вось такія — адны, такіх — таксама трое...

Жанчыны, што стаяць побач, здзіўлена глядзяць — на прадавачку, што складае ў стос усё адабранае, на цікавую пакупніцу і нарэшце — адна на адну:

— Мусіць, нейкі мужык прыбіўся? — ціха, па-змоўніцку зазначае першая.

— Ну-у... — згодна ківае другая і праз паўзу дадае: — Але чаму без трусоў?

...Народ здавён прыкмячаў — баба, пакуль з печы ляціць, сем дум перадумае. Што цікава — заўсёды знойдзе, пра што.

Праверана

Сталіца. Ранічка. Праспект: машын на дарозе — гіблота, пешаходаў на ходніку — не, раз, два і аблічыўся. Прычым літаральна: мужык напярэдзе — гэта раз, я — два, сабачка — маленькі, беленькі... Толькі што быў...

Ёсць — вынырнуў вунь з-за куста, падбег «пазнаёміцца», паганяў галубоў, зноў схаваўся ў прысадзе і раптам — сэрца зайшлося — рвануў на дарогу, пад колы машын.

— Джэк, Джэк! Назад! — загалёкаў мужык.

Сабачка — ужо на тым баку вірлівага праспекта — на імгненне замёр, спыніўся і... даўся назад, на голас.

Яшчэ раз завісчэлі тармазы, яшчэ раз здалося, што ўсё — не жылец, загіне.

Пранесла, дзякаваць Богу.

— Шчаня яшчэ... Пяць месяцаў толькі, — падхапіўшы малога на рукі (павадка няма), стаў тлумачыць мужык. — А вы ж чулі выраз: «Дурны, як сабака да году»? Праверана — праўда!

...Як і тое, відаць, што кожны сабака (узрост яго ні пры чым) падобны... Да гаспадара.

Рамантыка?

Вечар. Вецер... Як ратунак ад яго — мой дом, мой пад'езд: на паверх бы подбегам, па прыступках?.. Сёння — не, еду ў ліфце, бо на лесвіцы — пара: ён і яна, гадоў па 16—17. Сядзяць, размаўляюць. А яшчэ, тромкаючы штось на гітары, ён спявае... Ёй...

Вясна... Рамантыка.

Раніца — як пахмелле, бо на тым самым месцы, дзе толькі што сядзелі двое, ды-ва-ном шалупінне ад семак, дзве «пластмаскі» з-пад піва, два акуратныя «стажкі» недакуркаў. Рамантыкі — як не было.

Ці яна цяпер вось такая?

Не пытанне

Абутковы ля дома — з усмешлівымі прадавачкамі, з багатым асартыментам. Яшчэ ўзімку там боты нагледзела — «мой памерчык», мой фасон. Адно — кошт не мой быў... Але ж цяпер там зніжкі: абутак (зімовы) — за паўцаны прадаюць.

Яшчэ раз зайшла ў магазін, яшчэ раз памерала. І, напэўна, купіла б, каб ведала, што налета (і ў прынцыпе...) зіма будзе. А калі зноў не?..

Роздум над пытаннем парушыў калега. Ён з камандзіроўкі прыехаў, з Целяханаў; расказаў, колькі там лыжаў на складах ляжыць!

А людзі ж працавалі, выпускалі іх, хацелі прадаць, чакалі прэмій, прыбыткаў...

На фоне іх праблем — маёй... не стала.

Калі — «з гранатай»

Тралейбус спыніўся (паміж прыпынкамі), гучна ляпнуў дзвярыма... Што азначае толькі адно: машына далей не пойдзе — хто спяшаецца, можа выходзіць, шукаць нейкі іншы транспарт. Зранку — толькі гэтых прыгод не хапала, але ж выйсця няма. Таму — на трамвай — подбегам, каб не спазніцца... І яшчэ — каб убачыць, па якой (канкрэтна) прычыне запынены рух: у мачту асвятлення (відаць, на хуткасці?) урэзаўся грузавік, і яна, парваўшы ўсе правады, рухнула на дарогу — проста цудам не пахаваўшы пад сабой тралейбус — дзесяткі, сотні пасажыраў... Жыццяў...

З-за аднаго...

Колькі ж гора ён (стомлены? хворы? п'яны? няўмека альбо самазабойца?) можа прынесці? Калі за штурвалам, за рулём... Калі «з гранатай»?

Пафарсіла

Каляжанка на грошы ўзбілася (можна сказаць, нарэшце). Першае, што купіла — новыя, мадняц

Запрашальнік

Джамшуд, Раўшан, Міхалыч і іншыя «комікі»

Футбольная каманда «Газмяс», супрацоўнік ДАІ і яго сяброўка, «гастарбайтэры» Джамшуд і Раўшан, чэлябінскія металургі Дулін і Міхалыч з нетрадыцыйнай арыентацыяй, мясцовыя «пацаны», якіх ніяк не пускаюць у начны клуб, міліцыянер, які ніколі не бярэ хабару... Цяжка паверыць, што ўсе гэтыя вобразы могуць быць увасоблены ўсяго ў двух чалавеках, але гэта так. Пад разнастайнымі «маскамі» хаваюцца былыя гульцы КВЗ Міхаіл Галусцян («Стомленыя сонцам», Сочы») і Сяргей Светлакоў («Уральскія пельмені», Екацярынбург).

Скетчком «Наша Russia» не проста склаў канкурэнцыю іншым забаўляльным праграмам — ён трывала ўвайшоў у жыццё многіх тэлегледачоў. А вось «жыўцом» яго героі выступаюць даволі рэдка. Напрыклад, перамовы аб выступленні ў Мінску доўжыліся... год. Але, нарэшце, маскоўскія менеджары пагадзіліся — і 13 мая а 19-й гадзіне «Джамшуд і Раўшан» (плюс каманда з 8 памагатых тэхнікаў) з'явяцца на сцэне Палаца спорту. Будуць многа і хутка пераапранацца, мяняць амплуа, жартаваць з публікай, імправізаваць. Пры неабходнасці абяцалі і сцэну адрамантаваць.

Адзінае, бадай, што ва ўсім гэтым не смешна, — цана білетаў. Ад 35 да 240 тысяч рублёў.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.



СІМВАЛ ГРАЦЫЁЗНАСЦІ І ЭТАЛОН ПУЖЛІВАСЦІ

Чалавек і прырода

Насельнікі вальера ва ўрочышчы Мяшкуці Астравецкага лясгаса.

Новыя насельнікі вальера ва ўрочышчы Мяшкуці (на сёння гэта 60 ланяў, 34 высакародныя алені і 10 плямістых аленяў) не баяцца хіба што толькі егера Станіслава Пашкевіча, які іх даглядае. А рэакцыя на чужынцаў імгненная і на «фотасесію» гэтыя жывёлы пакідаюць журналісту лічаныя секунды. Відаць, іх генетычная памяць захоўвае не толькі прыемнае. І адсюль гэты, можна сказаць, эталон пужлівасці. Але, разам з тым, лань — гэта і сапраўдны сімвал грацыёзнасці!

Праект «Сарачанскія азёры» рэалізуецца на Астравеччыне ў адпаведнасці з Дзяржаўнай праграмай развіцця паляўнічай гаспадаркі на 2006—2015 гады. Згодна з ёй прадугледжана стварэнне новых папуляцый жывёл (высакародны алень, плямісты алень, лань, мухлон і іншыя) шляхам іх рассялення ў найбольш спрыяльных для далейшага размнажэння месцах. Навуковае абгрунтаванне (з улікам кармавой базы, іншых батанічных і біялагічных магчымасцяў) праводзілі спецыялісты Інстытута заалогіі НАН Беларусі. Загадчык лабараторыі тэрыялогіі Пётр Козла адобрыў будаўніцтва вальера ва ўрочышчы Мяшкуці, а работнікі лясгаса пастараліся ўлічыць яго рэкамендацыі.

206-гектарны вальер складаецца з трох секцый — для аленя высакароднага, аленя плямістага і лані. Першымі сюды ў мінулым годзе трапілі з Белавежскай пушчы трыццаць высакародных аленяў і ўжо атрыманы першы прыплод — чацвёра аленянят. Сёлета, спадзяецца намеснік дырэктара Астравецкага лясгаса Пётр Крупенчык, папаўненне будзе значна большым.

Дзесяць плямістых аленяў купілі ў Валожынскім лясгасе. А вось для набыцця ланяў Міністэрствам лясной гаспадаркі быў праведзены тэндар, у якім перамагла фермерская гаспадарка з Літвы, дзе, дарэчы, няма адбою ад ахвотнікаў папаляваць, асабліва немцаў. За 54 самкі і 6 самцоў, што пераехалі на Астравеччыну, Мінлясгас заплаціў амаль 60 тысяч долараў. Грошы немалыя і ці вартая, як кажуць, аўчынка вырабу?

Наконт гэтага маецца не толькі шмат прыкладаў у замежжы, але і наш айчынны вопыт, паколькі і аленям, і ланям Беларусь знаёмая з даўніх часоў. Вось толькі некаторыя факты, з якімі знаёміць доктар біялагічных навук Пётр Козла.

ЛАНЬ ЕЎРАПЕЙСКАЯ. У пушчы «Белавежская пушча» (1903 г.) Георгій Карцаў паведамляе, што падчас царскага палявання ў 1860 годзе на лініі стралкоў з'явіліся лані. На думку Карцава, яны эмігравалі з арыстакратычных паркаў Польшчы, дзе пры сядзібах меліся звярынцы. У наступныя гады ланяў неаднаразова завозілі ў пушчу, ператрымлівалі ў спецыяльным звярынцы, а затым выпускалі на волю. У 1895 г. у пушчы ўжо мелася 740, у 1908 г. — 1209, у 1914 г. — 1488 (па іншых звестках — каля 2000) ланяў. Аднак неўзабаве іх, як і зуброю, па вядомых прычынах (вайна, браканьерства, драпежнікі) цалкам вынішчылі. У 1920 годзе ланяў у пушчы ўжо не было.

Цікава, што згодна з Літоўскім статутам (1811 г.) незаконны адстрэл лані караўся штрафам у памеры «6 рублёў грошай», што ў сучасных цэнах складае прыкладна 3600 амерыканскіх долараў. Значыць, лань вадзілася ў лясах Вялікага княства Літоўскага. І вопыт пушчы, лічыць Пётр Козла, пераконвае, што ёсць усе падставы для таго, каб гэта жывёла стала новым і даволі масавым відам паляўнічай фаўны ў Беларусі. Прычым яе перспектывы звязаны не толькі з паляваннем. Лані могуць упрыгожыць заасады нашых лясгасаў — на радасць турыстаў і ўсіх, хто неабыякавы да прыроды.

Дарэчы, лань вельмі неперабарлівая да корму. Харчуецца травяністымі раслінамі, апалымі жалудамі, арэхамі і пладамі, лісцем дрэў і кустоўя, грыбамі і ягадамі, зімой таксама ўжывае кару, пупышкі і парасткі, зрэдку хваёвыя лапкі.

Гон адбываецца восенню. Стук рагоў падчас бязлітаснай бойкі самцоў чуваць за сотні метраў. Бывае, зверы стукаюцца з такой сілай, што ламаюць рогі. Але часцей яны абмяжоўваюцца дэманстрацыяй сваёй моцы і абыходзіцца без сур'ёзнага паядынку.

Самкі прыносяць першае аленяня (амаль заўсёды адно) у два—тры гады. Спачатку малы ляжыць нерухома ў густой траве, а маці пасецца паваддаль, каб не наклікаць драпежнікаў, і толькі некалькі разоў у дзень прыходзіць пакарміць. Праз сем—дзесяць дзён аленяня пачынае хадзіць за маці і есці траву, а да зімы перастае ссаць малако.

ПЛЯМІСТЫ АЛЕНЬ. Радзіма — Усходняя Азія, але ён шырока рэакліматызаваны ў многіх краінах свету, у тым ліку ў рэспубліках былога СССР. Па комплексу прыродных умоў практычна ўся тэрыторыя Беларусі прыдатная для развядзення плямістага аленя, але перавагу, мяркуе Пётр Козла, трэба аддаць паўднёва-заходняй і цэнтральнай частцы краіны. Менавіта тут ужо арганізавана некалькі фермаў пры сельгаспрадпрыемствах і лясгасах.

Перыяд гону — з апошняй дэкады верасня да канца кастрычніка. Пры добрых кармавых умовах да дваццаці працэнтаў самак прыносяць двойні.

Акрамя таго, у рамках праграмы Мінлясгаса ў Беларусь плануецца завезці **еўрапейскага муфлона,** які раней таксама вадзіўся ў нашых лясах. Вядома, што ў 1968 годзе ў Белавежскую пушчу завезлі дванаццаць муфлонаў. Нягледзячы на страты шасці асобінаў, у 1979 годзе ў невялікім вальеры на тэрыторыі зубрагадавальніка ўтрымлівалася дваццаць муфлонаў. Аднак у далейшым гэтыя жывёлы не атрымалі належнага клопату. Хоць яны па шэрагу якасцяў проста ўнікальныя. Чаго вартыя толькі прыгожа выгнутыя цёмна-карычневыя рогі, якія з'яўляюцца зайздросным трафеем для паляўнічага. Высока цэніцца і мяса. Да таго ж, муфлон выкарыстоўваецца для вывядзення новых пародаў свойскіх авечак, дае пладавітае патомства.

Што ж датычыцца галоўных ворагаў муфлона (як і ланяў, аленяў), то гэта ваўкі. Нованароджаныя могуць таксама стаць ахвярай рысі, лісы і, верагодна, янотападобнага сабакі. Вось калі трэба падзяжаваць вальернаму ўтрыманню.

На тэрыторыі Астравецкага лясгаса атрымалі новую «прапіску» 60 ланяў. І не толькі яны

...Такім чынам, пасля рассялення па розных рэгіёнах Беларусі белавежскіх зуброў пачынаецца стварэнне новых папуляцый і іншых відаў жывёл. І сапраўды, нашы ўмовы нічым не горшыя, чым у той жа Германіі, дзе ў 2002 годзе было здабыта 42 140 ланяў, 5763 муфлоны і 4568 сернаў. Колькасць высакародных і плямістых аленяў, паведаміў Пётр Козла, перавышае ў Еўропе 412 тысяч асобінаў, у Азіі гэтых і іншых відаў — больш за 1 мільён 170 тысяч асобінаў. А ў Новай Зеландыі толькі высакародных аленяў і ланяў налічваецца каля 2 мільёнаў 560 тысяч асобінаў. Штогод на 4,5 тысячах фермах тыпу «ранчо» ў гэтай краіне вырабляецца ад 15 да 25 тысяч тон мяса дзічыны (у параўнанні са свойскай жывёлай у ім больш карысных для чалавека мікраэлементаў і меншае ўтрыманне тлушчу) і 500—700 тон пантоў. У Англіі 120 вальерных фермерскіх гаспадарак, у Чэхіі — 91. Вальернае развядзенне звычайна накіравана на вырошчванне жывёл высокіх трафейных якасцяў для продажу ліцэнзій, правядзення паляванняў і развіцця паляўнічага турызму на камерцыйнай аснове.

Цалкам лагічна, што ў гэтым накірунку пачынаем дзейнічаць і мы. Першыя крокі абнадзейваюць. У прыватнасці, жывёлам, якія цяпер даглядаюцца ў вальеры ва ўрочышчы Мяшкуці, голад не пагражае і ніякай патрэбы наносіць урон пупышкам і парасткам дрэў, пэўна, не існуе. Угоддзі самі па сабе багатыя на корм плюс яшчэ ўнутры вальера ёсць участкі для вырошчвання рапсу, маслянічнай рэдзькі, клеверу. Летась пасеялі дзевяць гектараў кукурузы, убралі на сілас і цяпер егер корміць ім сваіх гадаванцаў. А яшчэ — сена, збожжа, буракі...

Дарэчы, у Астравецкім лясгасе плануюць завоз у вальер новых насельнікаў, у прыватнасці, аленя высакароднага не толькі белавежскай, але і іншай папуляцыі.

Барыс ПРАКОПЧЫК.
Астравецкі раён.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.48	20.28	14.40
Віцебск —	5.34	20.22	14.48
Магілёў —	5.38	20.19	14.41
Гомель —	5.39	20.11	14.32
Гродна —	6.04	20.43	14.39
Брэст —	6.09	20.39	14.30

Месяц
Поўня.
Месяц у сузор'і Стральца.

Імяніны
Пр. *Анціпа, Івана, Прохара, Пятра, Рыгора, Якава.*
К. *Валеры, Аляксандра, Аляксея, Рыгора.*

НАДВОР'Е на заўтра

Геамагнітныя ўзрушэнні



Абазначэнні:
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
— невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
— слабая геамагнітная бура

...у суседзяў

Варшава	+19..+21°С	Кіеў	+15..+17°С	Рыга	+14..+16°С
Вільнюс	+13..+15°С	Масква	+12..+14°С	С.-Пецярбург	+11..+13°С

Дзве даты

24 красавіка

Сёння — Сусветны дзень салідарнасці моладзі. Адзначаецца штогод, пачынаючы з 1957 года, па рашэнні Сусветнай федэрацыі дэмакратычнай моладзі.

1876 год — адбылася забастоўка рабочых Мінскіх чыгуначных майстэрняў — першае арганізаванае выступленне рабочых у Беларусі.

1944 год — загадам Вярхоўнага галоўнакамандуючага створаны 2-і Беларускі фронт (першы камандуючы генерал І. Пятроў) і 3-і Беларускі фронт, які ўзначаліў генерал І. Чарняхоўскі.

Цытата дня:

«Наколькі высока ты знаходзішся, залежыць выключна ад таго, што ты лічыш дном».

Эшлі Брыльянт (нар. 1933), амерыканскі карыкатурыст і гумарыст.

Усміхнёмся!

На дзень нараджэння мама дорыць малому прыгожую цацку.

— Ну, што трэба сказаць?

Малы маўчыць.

— Ну, што я кажу тату, калі ён прыносіць дадому зарплату?

— І гэта ўсё?!

☺

Як кажуць касманаўты, бутэрброд заўсёды падае маслам уверх, а калі выпіць, дык яшчэ і ў даганялкі пачынае гуляць.

☺

— Афіцыянт! Я заказваў мяса пад лімонам! Дзе ж мяса?!

— А вы пад лімонам глядзелі?

☺

Нельга быць адначасова вясёлым, цвярозым і разумным...

*Калектыў дзіцячай установы № 230 г. Мінска віншуе загадчыцу **Наталлю Мікалаеўну ПЯТРЭНКА** з юбілеем. Зычым здароўя, цудоўнага настрою, здзяйснення ўсіх надзей.*

КУПАЛА
VIENNA INSURANCE GROUP

Совместное белорусско-австрийское Закрытое акционерное страховое общество «КУПАЛА» тел. 200-80-27 GSM 682-80-27, 707-80-27, факс 2008013 220004, Минск, ул. Немига, 40, УНП 500048039 www.kupala.by e-mail: office@kupala.by

Бухгалтерский баланс СБА ЗАСО «Купала» за 2007 год

тыс. руб.

АКТИВ		ПАССИВ	
1	2	3	4
Основные средства	1 200 402.1	Источники собственных средств — всего	2 461 190.5
Нематериальные активы	11 605.6	В том числе:	
Финансовые вложения — всего	682 851.6	уставный фонд	1 360 175.0
В том числе:		резервный фонд	189 733.6
инвестиции в дочерние общества		добавочный фонд	231 035.4
инвестиции в другие организации		фонд накопления	569 045.1
облигации и другие долговые обязательства		фонд потребления	32 218.8
прочие финансовые вложения	682 845.6	целевое финансирование	
Доля перестраховщиков в страховых резервах	833 673.0	нераспределенная прибыль прошлых лет	
		нераспределенная прибыль отчетного года	78 982.6
Дебиторы — всего	580 966.9	Страховые резервы и фонды — всего	2 829 293.5
В том числе: дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования	190 594.9	В том числе: страховые резервы	2 628 550.8
		фонд предупредительных (превентивных) мероприятий	200 742.7
депо премий по рискам, принятым в перестраховании		гарантийные фонды	
дебиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	390 372.0	Кредиторы — всего	347 076.0
		В том числе: кредиторская задолженность по операция мстрахования, сострахования	81 292.2
Прочие активы — всего	2 568 262.3		
В том числе: незавершенное строительство		кредиторская задолженность по операциям перестрахования	
материальные ценности и затраты	91 056.3		
денежные средства	2 477 206.0	депо премий по рискам, переданным в перестраховании	
собственные акции (доли)		заемные средства	
прочие активы		кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	265 783.8
Непокрытые убытки прошлых лет			
Непокрытые убытки отчетного года		Прочие пассивы	240 201.5
БАЛАНС	5 877 761.5	**БАЛАНС**	5 877 761.5

Отчет о финансовых результатах СБА ЗАСО «Купала» за 2007 год

тыс. руб.

Наименование показателя	Код строки	За отчетный период
1	2	3
I. Страхование жизни		
Страховые взносы (премии)	010	
Страховые выплаты	020	
Изменение резерва по страхованию жизни (+ или -)	030	
Отчисления в гарантийный фонд	040	
Расходы на ведение дела	041	
Результат от операций по страхованию жизни (+ или -)	050	
II. Страхование иное, чем страхование жизни		
Страховые взносы (премии) нетто-перестрахование	064	3 906 407.6
Изменение резерва незаработанной премии — нетто-перестрахование (+ или -)	067	-489 885.8
Оплаченные убытки (страховые выплаты) — нетто-перестрахование	082	1 625 013.8
Изменение резервов убытков — нетто-перестрахование (+ или -)	092	-296 417.4
Изменение других технических резервов (+ или -)	100	
Изменение иных страховых резервов (+ или -)	105	
Отчисления в фонд предупредительных (превентивных) мероприятий и гарантийные фонды	110	140 565.4
Расходы на ведение дела	120	1 679 485.3
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование	121	163 141.4
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестраховании	122	82 079.6
Результат от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (+ или -)	130	-243 898.3
III. Прочие доходы и расходы, не отнесенные в разделы I и II		
Операционные доходы	140	206 830.9
Операционные расходы	145	17 183.0
Внереализационные доходы	150	325 445.3
Внереализационные расходы	155	118 698.2
Нераспределенная прибыль (убытки) отчетного периода (+ или -)	170	78 982.6

Аудитор — Общество с дополнительной ответственностью «ГлобалАудит», лицензия на осуществление аудиторской деятельности № 02200/0061697 от 14.11.2005 г. выдана Министерством финансов РБ, полагает, что проведенный аудит дает достаточные основания для выражения аудиторского мнения о достоверности во всех существенных отношениях бухгалтерской отчетности СБА ЗАСО «Купала» и соответствии совершенных им финансовых (хозяйственных) операций законодательству РБ. Бухгалтерская отчетность СБА ЗАСО «Купала» отражает достоверно во всех существенных отношениях его финансовое положение на 1 января 2008 года и результаты финансово-хозяйственной деятельности за 2007 год.

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 **№ 10 (261)**

Морква роўная, гладкая

«Чаму ў мяне морква вырастае з двума хвастамі і ўся ў баразёнках, а гарбузы, у асноўным, — пустацвет. Чаму так атрымліваецца?» — пытаецца Аліна Іосіфаўна са Смаргонскага раёна.

Каб морква была роўная, без наростаў, вопытныя агароднікі за тры дні да высеву моркавы паліваюць градку салёнай водой. Усе агароднікі ведаюць, што нельга высяваць моркву на ўчастку, дзе толькі што ўносілі гной, таму што пры гэтым павялічваецца колькасць разгалінаваных караняплодаў. Некаторыя агароднікі высяваюць моркву з попелам.

Перад высевам насенне моркавы трэба змяшаць з сухім жоўтым пяском — 5 г насення на паўлітровы слоік. На падрыхтаванай градцы робяцца баразёнкі, якія трэба паліць вадой, у радочкі насыпаць драўнінны попел, на які высяваецца насенне моркавы разам з пяском (на жоўтым пяску добра відаць насенне морквы). Па засеянай баразёнцы зноў пасыпаць попел, крыху прымяць рукой і засыпаць рыхлай зямлёй слоем 1,5 см. Попел — угнаенне для моркавы, акрамя таго, ён адпужвае маркоўную муху: калі побач ёсць попел, муха не бывае такой настырнай. Пры такой сяўбе з пяском і прарэджваць моркву не даводзіцца, насенне кладзецца роўна і рэдка. А маркоўная муха, якая потым пачынае рабіць баразёнкі на дарослых караняплодах, пачынае сваю шкодную дзейнасць задоўга да ўборкі ўраджаю. Першы яе вылет адбываецца, калі цвіце чаромха і вішня. Так што старайцеся ў гэты час не сеяць моркву, каб не спакушаць шкодніка пахам насення. Другі аблёт яна робіць у пачатку ліпеня, калі ў морквы з'яўляюцца першыя лісточкі. У асноўным ідзе першая праполка. Калі ўсё ж такі моркву даводзіцца прарэджваць, то як мага далей выносьце вырваную моркву разам з пустазеллем, зноў жа, каб не спакушаць шкодніка. У гэты час моркву трэба апрацаваць любым інсектыцыдам: дэцыс (0,1 л на га), шэрпа (0,2 л на га), сумі альфа (0,15—0,20 л на га). Калі не апрацаваць, муха адкладзе лічынкі, якія і робяць хады. У час захоўвання плод мае непрыемны выгляд і морква нясмачная, таму што шкоднік жывіцца яе сокам з самага пачатку з'яўлення плода. На агародзе трэба чаргаваць радкі морквы з радкамі цыбулі, ці паблізу высаджваць часнок. І цыбуля, і часнок адпужваюць шкодніка. Праполку моркавы лепш праводзіць пад вечар, а не ў самы поўдзень, калі муха бывае вельмі актыўная.

Некаторыя агароднікі думаюць, што караняплоды буракоў і моркавы дапамагаюць адзін аднаму. Але, як вынікае, буракі прыгнечваюць моркву, побач гэтыя культуры сеяць не варта.

Морква лепш за ўсё добра расце пасля тых культур, глеба пад якія была запраўлена арганікай: ранняй капусты і ранняй бульбы, таматаў, агуркоў, а таксама збожжавых, пасля цыбулі і кукурузы. Моркву не сеюць пасля кропу, сельдэрэя, пятрушкі, пастэрнака, фенхеля, кмену, каляндры. Непажадана сеяць моркву пасля буракоў, рэдзькі, радыскі, тапінамбура.

(Адказ на другую частку пытання, Аліна Іосіфаўна, чытайце ў наступным выпуску.)

Кветнік у красавіку

Нарцысы, гіяцынты, цюльпаны і ўсе цыбульныя расліны трэба падкарміць поўным мінеральным угнаеннем (30 г аміячнай салетры, 20 г суперфасфату, 30 г калійнай солі на 1 кв. м). Глебу паміж радкоў падрыхліце.

У адкрыты грунт высявайце наготкі, астры, мак, эшольцыю, алісум, тагеціс, разяду, касмею.

У кветнік садзіць ружы. Перад пасадкай абразаюць сякатарам пашкоджаныя ці надломленыя карані. Рамантантныя ружы таксама абразаюць, пакідаючы на кожным здаровым парастку па 6—8 пупышак, чайна-гібрыдныя абразаюць коратка, да 2—3 пупышак. У пляцістых і паркавых руж выразаюць падсохлыя і слабыя галінкі. Каб расліны пасля інтэнсіўнай абрэзкі не падсыхалі, акучваюць іх так, каб абрэзкі былі поўнасцю пакрытыя зямлёй.

Канец красавіка — лепшы час для чаранкавання флёксаў. Калі парасткі флёксаў дасягаюць 5—8 см, іх выламваюць і высаджваюць на градкі па схеме 4х4 см, прыкрываючы шчытамі і сістэматычна апырскваючы. Яны ўкараняюцца праз 3—4 тыдні.

У канцы красавіка высаджваіце гладыёлусы, мантброэцыю. Клубнецыбуліны і дзеткі гэтых раслін перад пасадкай звычайна замочваюць на двое сутак у цёплай вадзе для таго, каб лепш прарасталі.

Зямлю вакол клематысаў, якія перазімавалі, асцярожна падрыхліце, каб не пашкодзіць каранёвыя парасткі, якія цягнуцца да святла.

У добра ўгноеную глебу высадзіце вяргіні, зрэшты, вялікія кусты мэтазгодна падзяліць.

Супраць тлі, белакрылкі, трыпсаў, кляшчоў апырскваюць 2-працэнтным растворам карбафосу, ад мучністай расы — 0,1-працэнтным растворам якога-небудзь фунгіцыду або 0,5-працэнтнай суспензіяй серы.

Каб захаваць ружы ад шкоднікаў і хвароб, абрэзаныя часткі спаліце, а кусты і глебу вакол іх апырскайце 1-працэнтным растворам селіну ці 5-працэнтным растворам жалезнага купарвасу. Глебу ў радках перакапайце, шкоднікі і ўзбуджальнікі хвароб, якія зімавалі на паверхні глебы, акаюцца засыпанымі зямлёй.

Шкоднікі і хваробы маліны

Уважліва агледзьце маліну. У верхнім слоі глебы, а таксама ля асновы сцябла зімуюць дарослыя лічынкі парасткавай галіцы, а лічынкі сцёблавай галіцы зімуюць унутры галаў на сцёблах маліны. У ніжняй частцы такіх парасткаў ёсць патаўшчэнні — «галы». Такія парасткі выразаюць і спальваюць. Гэта трэба зрабіць да цвіцення маліны.

Калі верхавінкі галінак маліны пашкоджаны мучністай расой, іх абразаюць да здаровай часткі і спальваюць разам з лісцікамі, якія распусціліся. Супраць мучністай расы на агрэсце добры сродак — кальцыніраваная сода (50 г на 10 л вады) з дабаўленнем 50 г мыла. Можна прымяняць і каравяк, разведзены вадой у суадносінах 1:3. Апрацоўку пры неабходнасці паўтараюць праз тыдзень. У верхавінках галін ягаднікаў могуць зімаваць споры розных грыбковых хвароб: антракнозу, розных плямістасцяў. Сцёблы і пупышкі маліны часта паражаюцца пурпуровай плямістасцю. Пры яе выяўленні да распускання пупышак кусты апырскваюць 5-працэнтным растворам мачавіны. Каб пазбегнуць заражэння грыбковымі хваробамі кустоў чырвоных і белых парэчак, агрэсту, іх апырскваюць 1-працэнтнай бардоскай вадкасцю.

Парастак, пашкоджаны маліннай сцёблавай галіцай.

Дачныя падказкі

■ **Каб дапамагчы садовым суніцам добра прыжыцца, можна зрабіць баўтушку з сумесі гліны і каравяку. Каравяк і гліну змешваюць у роўных частках, робяць сумесь смятанападобнай і ў яе акунаюць перад пасадкай каранi суніц садовых. Асабліва карысна рабіць гэта на пясчаных глебах, якія дрэнна затрымліваюць вільгаць.**

■ Календулу спецыялісты рэкамендуюць падсяваць да асноўнай агароднай культуры ў якасці прафілактычнага сродку супраць каранёвай гнілі, фузарыёзных захворванняў і кляшчоў.

■ **Яблыню і вішню ў садзе высаджваюць як мага далей адна ад другой. Карані гэтых раслін дзейнічаюць прыгнятальна адна на адну.**

■ Цюльпаны добра выглядаюць ў кампазіцыі з незабудкамі.

■ **Лубін эфектна выглядае ў змешаных пасадках разам з касачамі, лілеямі, хостамі.**

■ Супраць мучністай расы на агрэсце прымяняюць кальцыніраваную соду (50 г на 10 л) з дабаўленнем 50 г мыла. Можна прымяняць і каравяк, разведзены з вадой у суадносінах 1:3. Апрацоўку пры неабходнасці праводзяць праз тыдзень.

Небяспечны шкоднік парэчак

Адзін з самых небяспечных шкоднікаў чорных парэчак — пупышкавы клешч, які паражае ўсе віды парэчак, ён развіваецца ўнутры пупышак. Пры харчаванні выдзяляе са слінай у тканку расліны галаўтваральныя рэчывы, у выніку пупышкі нармальна не развіваюцца. Вясной такія пупышкі не распускаюцца і засыхаюць.

Клешч небяспечны яшчэ і тым, што з'яўляецца пераносчыкам віруса, які выклікае махровасць парэчак. Шкоднік можа распаўсюджвацца пры чаранкаванні парэчак, а таксама з дапамогай ветру, дажджу і насякомых. Зімуе пупышкавы клешч унутры пашкоджаных пупышак. Калі сярэднясутачная тэмпература ўстанаўліваецца плюс 5 градусаў, пачынаецца яйкакладка і развіваецца новае пакаленне ўнутры заражаных пупышак. З'яўленне самак новага пакалення супадае з масавым цвіценнем парэчак. У пачатку цвіцення ранніх гатункаў пачынаецца масавая міграцыя кляшчоў. Яны выходзяць са старой пупышкі, распаўзаюцца па расліне, пранікаюць у пупышкі, якія нанава фарміруюцца, дзе і працягваюць развіццё. Каля месяца лічынкі растуць, а затым пачынаюць актыўнае размнажэнне ўнутры заражанай пупышкі. Да канца лета заражаныя пупышкі прыкметна выдзяляюцца. Размнажэнне ўнутры новых пупышак працягваецца да каст-

Вусень першага ўзросту ў пупышцы парэчкі.

рычніка. За год клешч дае пяць пакаленняў. Каб папярэдзіць заражэнне пры закладцы плантацый парэчак, трэба выкарыстоўваць, па-першае, здаровы пасадачны матэрыял. Каб абеззаразіць чаранкі, трэба апусціць іх у гарачую ваду (45 °С) на 15 хвілін. Вясной, да распускання пупышак (сакавік—пачатак красавіка) праводзяць выкарчоўку і спальванне моцна заражаных кустоў, выразаюць заражаныя парасткі, збіраюць і знішчаюць паражоныя пупышкі парэчак. Перад самым цвіценнем супраць кляшчоў-мігрантаў трэба правесці апырсканне калоіднай серай з разліку 10—20 г на куст. На прысядзібных участках сярод кустоў рэкамендуецца вырошчваць часнок і цыбулю. Фітанцыды гэтых раслін адпужваюць кляшча. Настой часнаку таксама выкарыстоўваецца для апырскавання. Для гэтага 50—80 г часнаку старанна расціраюць, затым размешваюць у 10 л вады і гэтай суспензіяй апрацоўваюць кусты адразу пасля цвіцення, паўтараюць 2—3 разы з інтэрвалам у 5—7 дзён.

Свежыя галінкі чорнай бузіны таксама адпужваюць кляшча.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 24 31 92, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by; www.zviazda.by/ru/main (*новая версія, якая тэсціруецца*)

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванне не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкоm, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.840 Індэкс 63850. Зак. № 2198. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12